Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 КРАСАВІКА 2016 г. СУБОТА № 66 (28176) Кошт 2400 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Выдаткі на градкі

СТАР. 8



Як размяркоўваюць будучых педагогаў?

СТАР. 10



Асцярожна: дыябет!

СТАР. 20

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

*«У такіх умовах надвор'я, калі ветрана і стаіць высокая тэмпература, што высушвае глебу, вялікае значэнне маюць тэрміны сяўбы. Цяпер трэба радыкальна паскараць тэмпы сяўбы, каб за 10-12 дзён засеяць збожжавыя. І тады можна будзе разлічваць на добры ўраджай. Я лічу, што кадры да гэтага гатовыя і задача будзе выканана».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.04.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 20 029,00 | ▼ |
| Еўра | 22742,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 296,76 | ▲ |
| Укр. грыўня | 780,86 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ДОКТАР ДЛЯ РОБАТАЎ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**11-класнік з мінскай гімназіі №29 Аляксандр ДУБАВІЦКІ не толькі «лечыць» робатаў, але канструюе іх. Юнак марыць паступіць у БНТУ і набыць спецыяльнасць робататэхніка і праграміста.**

■ Занятасць

## УЧАРАШНІЯ ШКОЛЬНІКІ, РАБОЧЫЯ І КІРАЎНІКІ

### Хто стаіць у чарзе па працу?



Фота Надзеі БУЖАН.

**Ці хутка сёння можна знайсці месца? На якія заробкі згаджаюцца саіскальнікі? І ў якой галіне ўладкавацца прасцей? Па адказы мы накіраваліся ў сталічную службу занятасці.**

### НАВУЧАННЕ НЕ ПРАПАНОЎВАЦЬ

У міжраённым аддзеле працаўладкавання «Першамайскі, Савецкі, Цэнтральны» шматлюдна. Адны наведвальнікі займаюць чаргу, каб трапіць на кансультацыю да спецыяліста, іншыя самастойна вывучаюць базу вакансій на камп'ютарах.

— Таксама па працу? — пытаемся ў дзяўчат, што сядзяць за сталом паводдаль.

Сяброўкі ківаюць. Адна з іх, Марыя, спрабуе ўладкавацца пасля школы. Служба занятасці адразу прапанавала дзяўчыне прайсці курсы цырульнікаў: больш шанцаў будзе знайсці месца. Але яе навучанне не надта зацікавіла:

— Я толькі працу хачу. Вакансію ўпакоўшчыка, прадаўца, напрыклад. Хоць бы тры мільёны пакуль атрымліваць. Але без вопыту не бяруць.

СТАР. 6

■ Нерухомасць

## СЕЗОН ПАЛЯВАННЯ НА ДАЧЫ

### Пад Мінскам садовыя домікі патаннелі толькі на 20%, а ў рэгіёнах кошты на некаторыя падобныя аб'екты знізіліся ў разы

**Спецыялісты агенцтваў нерухомасці паведамляюць, што яшчэ летась стандартныя дачы былі не ў модзе. Але цяпер сітуацыя кардынальна змянілася. І гэта прытым, што кошты аселі не так значна, як на рынку кватэр мегаполіса і абласных цэнтраў краіны. «Звязда» высветліла, якія варыянты дач карыстаюцца найбольшым попытам.**

### КАБ БЛІЗКА І НЯДОРАГА

Рыэлтары ўпэўненыя, што бюджэтныя дачы з'яўляюцца адмысловым барометрам эканамічнага дабрабыту. Бо калі ў сярэдняга класа дастаткова грошай, тады звычайныя «соткі» ў садовых таварыствах попытам амаль не карыстаюцца. А вось падчас зацягвання паясоў і памяншэння даходаў падобныя ўчасткі з пабудовамі без пэўных выгод робяцца запатрабаванымі.

СТАР. 4



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ПАСТАЎЛЕНА ЗАСЛОНА

Прынятыя ў краіне сістэмныя меры ў сферы процідзеяння распаўсюджванню наркотыкаў далі магчымасць пераламаць сітуацыю на найбольш небяспечных напрамках, аднак падставы для насцярожанасці захоўваюцца

**Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў на нарадзе на тэму процідзеяння незаконнаму абароту наркотыкаў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«У нашай краіне, як ні ў якой іншай дзяржаве, створана выразная сістэма, якая вызначае не толькі галаўное ведамства, але і паўнамоцтвы ўсіх адказных дзяржаўных органаў і іншых арганізацый на гэтым напрамку. Настойлівасць і сістэмныя рашэнні ў сферы процідзеяння распаўсюджванню наркотыкаў сапраўды дазволілі пераламаць сітуацыю на найбольш небяспечных напрамках. Гэта выбіла ў наркадзялкоў глебу з-пад ног у пытаннях вырабу зелля, у прыватнасці з насення маку. Пастаўлена заслона распаўсюджванню спайсаў, што выратавала не адно маладое жыццё», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Разам з тым, падкрэсліў Прэзідэнт, супакойвацца пакуль рана. Беларусь не ізалявана ад астатняга свету, і наркапагроза застаецца. Неабходна прааналізаваць сітуацыю і вызначыць, якія дадатковыя рашэнні патрэбны ў сувязі з гэтай праблемай. «Мы заўсёды ганарымся тым, што наша краіна транзітная, мы атрымліваем ад гэтага пэўныя выгады. Але ў той жа час ёсць вялікі негатыў, і ён, на жаль, павялічваецца, асабліва ў сувязі з падзеямі ва Украіне», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка пры гэтым канстатаваў, што больш за ўсё наркотыкаў у Беларусь паступае з тэрыторыі Расіі. «Мы гэта не проста фіксуем, а канфіскоўваем адпаведнае зелле ў наркаманаў і добра разумеем, адкуль усё гэта», — сказаў Прэзідэнт.

Распаўсюджванне наркотыкаў — гэта бяда не толькі для канкрэтнага чалавека або сям'і, але і для грамадства ў цэлым, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Так, за два гады ад перадазіровак у Беларусі памерлі 80 чалавек. «На жаль, паміраюць людзі не проста працаздольнага ўзросту, а моладзь, асабліва ад так званых спайсаў», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што пры падрыхтоўцы дэкрэта №6 «Аб неадкладных мерах па процідзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў» ён даручаў стварыць у месцах пазбаўлення волі найбольш жорсткія ўмовы для вінаватых у нарказлачынствах. Адпаведная работа праведзена, і на нарадзе плануецца абмеркаваць яе вынікі.

# СПОРТ — БЕЗ ПАЛІТЫКІ

Беларусь неўзабаве зможа прыняць любыя міжнародныя спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы

**Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з прэзідэнтам Міжнароднай асацыяцыі лёгкаатлетычных федэрацый Себасцьянам Коэ, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Беларусь ужо з наступнага года зможа правесці любое мерапрыемства па лёгкай атлетыцы. Мы спецыяльна мадэрнізуем наш нацыянальны стадыён менавіта пад лёгкую атлетыку. Там можна будзе гуляць у футбол, але гэта будзе лёгкаатлетычны стадыён, створаны па апошнім слове тэхнікі з запасным трэніровачным полем і ўсімі атрыбутамі для работы спартсменаў», — заявіў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што хоць па глабальных мерках Беларусь і не ўваходзіць у лік вялікіх дзяржаў, аднак у краіне існуюць нядрэнныя спартыўныя традыцыі ў многіх відах спорту. «У нас добрыя школы, якія дасталіся нам з савецкіх часоў. Мы іх захавалі. Часам не хапае настойлівасці і, можа, нейкай увагі, — адзначыў Прэзідэнт. — Спецыялістаў у нас дастаткова практычна ў любым відзе спорту, але нам не хапае сістэмы функцыянавання таго ці іншага віду спорту, арганізацыі, патрабавальнасці, абавязковасці ад трэнераў і спартсменаў. Але грош было б, калі б не хапала грошай або ўмення. Але калі гэта ўсё ёсць, але не хапае арганізаванасці, то гэту справу можна паправіць».

«Калі ў спорце будзе ўсё справядліва, я ўпэўнены, што беларускія спартсмены на сусветных арэнах, Алімпійскіх гульнях будуць яшчэ прыкметней. Я гэта гавару, ведаючы вашу пазіцыю, памкненні і арыентацыю на сумленнасць і прыстойнасць у спорце. І вы ў гэтым плане можаце разлічваць на Беларусь», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

«У спорце не павінна быць столькі палітыкі, колькі сёння. У спорце не павінны перамагаць спартсмены толькі буйных багатых дзяржаў. Спорт павінен быць для ўсіх. Таму я катэгарычна супраць усякіх закрытых пытанняў у спорце, у тым ліку допінгу, што якой-небудзь краіне гэта можна, а іншай нельга. Я супраць таго, каб грошы вырашалі пытанні. Таму што багатая краіна будзе заўсёды выйграваць. Спорту не хапае справядлівасці», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць станоўчым той факт, што ў сусветнай лёгкай атлетыцы працуюць спецыялісты, якія па-сапраўднаму ведаюць і разумеюць спорт. «Менавіта гэтага разумення ў многіх функцыянераў у многіх відах спорту якраз не хапае — разумення спартсмена, — сказаў Прэзідэнт. — Мне здаецца, што такія людзі, як вы, якія прайшлі праз горан спорту і паказалі выдатныя вынікі, якраз здольны змяніць сітуацыю ў спорце».

Кіраўнік дзяржавы таксама з цеплынёй успомніў той час, калі Себасцьян Коэ змагаўся на спартыўных спаборніцтвах. «Успамінаю маладосць і Себасцьяна Коэ на беглавой дарожцы, супраць якога я, вядома, заўсёды балеў, таму што побач з вамі заўсёды былі нашы вялікія спартсмены. Але я заўсёды быў у захапленні ад вас», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

■ Знешні вектар

# АД КАНФЛІКТАЎ ВЫРАТУЕ ІНТЭГРАЦЫЯ

**Такое меркаванне выказаў у Маскве падчас учарашняй прэс-канферэнцыі, прысвечанай беларуска-расійскаму супрацоўніцтву, міністр замежных спраў нашай дзяржавы Уладзімір МАКЕЙ. Па яго словах, і Беларусь, і Расія выступаюць «за пераадоленне геапалітычнага эгаізму».**



Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства адзначыў, што сёння ў свеце існуе мноства негатыўных з'яў: ад Нагорнага Карабаха да сітуацыі на Данбасе. У такіх умовах, лічыць міністр, асабліва важныя інтэграцыйныя працэсы.

«Неабходна пераадолець геапалітычны эгаізм, за што заўсёды выступаюць Беларусь і Расія», — заявіў Уладзімір Макей.

Міністр высока ацаніў развіццё і Саюзнай дзяржавы, і Садружнасці Незалежных Дзяржаў. У размове пра СНД Макей нагадаў аб неабходнасці яе рэфармавання, але падкрэсліў, што ні аб якім скасаванні саюза і гаворкі быць не можа. Па словах кіраўніка знешнепалітычнага ведамства краіны, СНД неабходна захаваць не толькі як пляцоўку для дыскусій, але і як структуру для выпрацоўкі важных рашэнняў.

### НАШ ГАЛОЎНЫ ПАРТНЁР

Уладзімір Макей заявіў, што наша дзяржава зацікаўлена ў безбар'ерным гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве з Расіяй і мы нацэлены на тое, каб усе праблемы ў гэтай сферы маментальна здымаліся. «Мы зацікаўлены ў тым, каб гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі ажыццяўлялася без усялякіх абмежаванняў, каб не было ніякіх бар'ераў на шляху нашых тавараў», — адзначыў міністр.

Што да адносін з Еўрапейскім саюзам, то Уладзімір Макей выказаўся так: «Расія — наш галоўны стратэгічны партнёр. Але мы можам быць у добрых адносінах і з Еўропай. Гэта ні ў якім разе не будзе на шкоду нашым інтарэсам з Расіяй».

### ПОДЛА Ў АДНОСІНАХ ДА ГІСТОРЫІ

Кіраўнік МЗС звярнуў увагу на тое, што адносіны Беларусі і Расіі «абрастаюць міфамі і скажонымі тлумачэннямі». Уладзімір Макей запэўніў журналістаў у сваёй гатоўнасці развеяць усе міфы. Падчас прэс-канферэнцыі ён падкрэсліў: калі Беларусь спрабуюць папракаць у распальванні нацыяналістычных, антырасійскіх памкненняў — гэта гучыць не проста подла. «Гэта кашчунства і ў адносінах да нашай сумеснай гісторыі, і да беларускага народа. Таму што мы заўсёды разглядалі Расію як самую блізкую дзяржаву».

Адказваючы на пытанне аб тым, наколькі ў грашовым выражэнні беларускі бок выйграў ад уведзенага Расіяй санкцыйнага рэжыму ў адносінах да заходняга харчавання, міністр замежных спраў заявіў: ад узаемных санкцый Расіі і ЕС Беларусь пакутуе, а не выйграе. «Казалі пра тое, што Беларусь выйграе, але рэспубліка нічога ад гэтага не выйграла, гэта толькі перашкаджае нам, — падкрэсліў Уладзімір Макей. — У цэлым мы прайгралі каля мільярда долараў ад санкцый».

Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства асабліва падкрэсліў, што наша дзяржава не падтрымлівае ідэю санкцый у адносінах паміж краінамі.

### ЗА СТАЛОМ ПЕРАМОЎ

Што да абвастрэння канфлікту ў Нагорным Карабаху, то, як заявіў міністр замежных спраў, наша дзяржава гатова зрабіць свой уклад ва ўрэгуляванне гэтай сітуацыі. Аднак, па яго словах, важна, каб канфліктуючыя бакі дамовіліся паміж сабой на аснове міжнароднага права, заявіў у пятніцу кіраўнік МЗС Беларусі Уладзімір Макей.

«Для нас і армянскі, і азербайджанскі народы — нашы браты», — заявіў Уладзімір Макей. Ён таксама паведаміў, што наша краіна выступае за вырашэнне канфлікту менавіта за сталом перамоў і зыходзячы менавіта з агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў міжнароднага права.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Каштоўнасць кадраў

# Выхоўваць журналістаў — задача прафесіяналаў

***Як рыхтаваць новыя кадры для СМІ? Якім чынам зрабіць падрыхтоўку журналістаў адпаведнай патрабаванням сучаснасці? Колькі маладых карэспандэнтаў патрэбна краіне? Гэтыя і многія іншыя пытанні абмяркоўвалі ўдзельнікі сумеснай калегіі міністэрстваў інфармацыі і адукацыі, якая прайшла на базе Інстытута журналістыкі БДУ.***

— Сёння ў краіне ёсць не толькі традыцыі падрыхтоўкі журналістаў, але і выдатная матэрыяльна-тэхнічная база журфака БДУ, — зазначыла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.** — Тым не менш у новых інфармацыйных умовах мы хочам зразумець, якія спецыяльнасці павінны з'явіцца ў Інстытуце журналістыкі, як больш эфектыўна арганізаваць практыку студэнтаў у СМІ. Галоўным пытаннем стане арганізацыя адукацыйнага працэсу такім чынам, каб сфарміраваць якасную нацыянальную інфармацыйную прастору.

Міністр падкрэсліла, што ўвага ўдзельнікаў калегіі будзе скіравана не толькі на сталічны журфак, але і на рэгіянальныя факультэты. «Мы абавязкова паглядзім, як забяспечыць працоўнымі месцамі маладых спецыялістаў, якія штогод выходзяць са сцен журфакаў, бо кожны, хто атрымлівае веды, павінен мець магчымасць укласці іх у развіццё гаспадаркі краіны», — зазначыла Лілія Ананіч.

— Пытанняў, якія мы хочам закрануць сёння, вельмі шмат, — сказаў **міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.** — Ёсць шэраг, так бы мовіць, «балявых кропак», якія хочацца абазначыць. У чым асноўная мэта падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў? Што павінен ведаць і ўмець журналіст? На наш погляд, цяпер вельмі важна рыхтаваць спецыялістаў-прафесіяналаў для розных сфер: эканомікі, адукацыі, аховы здароўя і гэтак далей. Хацелася б, каб на старшых курсах або ў магістратуры практыкавалася мэтавая падрыхтоўка журналістаў па кірунках, каб яны ведалі праблемы свайго адгалінавання, умелі іх правільна абазначыць. Тым больш што ад сфарміраваных у тым ліку і ў СМІ вобразаў прафесій педагога, урача залежыць, ці будуць гэтыя спецыяльнасці папулярнымі сярод моладзі. Нам бы хацелася, каб таленавітая моладзь ішла менавіта ў педагогі, бо ў гэтым будучыня краіны.

Міністр адукацыі адзначыў, што ў цэлым падрыхтоўка журналістаў у краіне знаходзіцца на высокім узроўні, вядучым СМІ ёсць з каго выбіраць маладых спецыялістаў. Тым не менш колькасць месцаў на журфаках трэба аптымізоўваць. Па словах Міхаіла Жураўкова, будзе прасоўвацца сеткавая форма арганізацыі навучання — магістратура для журналістаў будзе дзейнічаць толькі ў тых ВНУ, дзе ёсць адпаведныя высокапрафесійныя кадры.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■ Справы вясковыя

# ЗАСЕЯНА ЎЖО 39% ПЛОШЧАЎ

Паўднёвыя рэгіёны краіны завяршаюць пасяўную

**Намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ГРАКУН станоўча ацэньвае ход сёлетняй пасяўной кампаніі. Структура пасяўных плошчаў сёлета распрацавана і арыентавана на тое, каб выканаць дзяржзаказ і забяспечыць жывёлагадоўлю кармамі і фуражом.**

### Больш зернебабовых

Асаблівасці гэтай пасяўной у тым, што прадугледжваецца павелічэнне плошчы для зернебабовых культур да 350 тысяч гектараў, сяўба аднагадовых траў плануецца ў аб'ёме большым за 500 тысяч гектараў. Таксама па плане неабходна засеяць шматгадовымі травамі больш за 1 млн гектараў.

Намеснік міністра нагадаў, што пасяўная пачалася на тыдзень пазней, чым у 2015 годзе. Пры гэтым адставанне ад леташніх тэрмінаў склала ўсяго 2—3 дні. У Беларусі пасеяны раннія збожжавыя на 39% плошчаў (гэта 365 тысяч гектараў), а паўднёвыя рэгіёны краіны ўжо практычна завяршаюць кампанію.

Сёлета ў краіне страцілі амаль палову азімага рапсу — больш за 122 тысячы гектараў. Адбылося гэта праз неспрыяльныя ўмовы надвор'я. Цяпер пастаўлена задача перасеяць гэтыя плошчы.

### Поўнач толькі пачынае

Як растлумачыў Уладзімір Гракун, апошнія два гады складваецца сітуацыя, калі паўднёвыя рэгіёны ўжо завяршаюць сяўбу, а паўночныя толькі пачынаюць. Па пасевах сёння лідзіруе Гомельская вобласць — 96%, у Брэсцкай вобласці пасеяна крыху менш — 80% плошчаў, у Мінскай — 40,5%, у Гродзенскай — 38%. Толькі пачынаюць сеяць у Магілёўскай і Віцебскай абласцях — 9,8% і 6,6% плошчаў адпаведна. Аднак, нягледзячы на такую разбежку, тэхнічныя магчымасці сёння дазваляюць вырашыць праблему адстаючых абласцей за 8-10 дзён. Гатоўнасць тэхнікі, як энерганасычаных трактароў, так і пасяўных агрэгатаў, складае каля 90% (у пасяўной удзельнічае больш за 5 тысяч энерганасычаных трактароў і 4200 пасяўных агрэгатаў).

### Угнаенняў і насення хопіць?

З забяспечанасцю насеннем збожжавых культур праблем таксама няма — сёлета яе ўзровень складае 159%. Ужо цяпер чакаецца, што будзе атрымана высокая аддача з кожнага гектара поля. Сродкі аховы таксама падрыхтаваны. На вясне забяспечанасць пратручванымі рэчывамі складае 66%.

Пасяўная кампанія гэтага года ацэньваецца прыблізна ў 15,6 трыльёна рублёў. З гэтай сумы 2,8 трыльёна накіроўваюць мясцовыя бюджэты, 5,6 трыльёна — крэдытныя рэсурсы, каля 8 трыльёнаў — уласныя сродкі гаспадарак. Заданне на жніво ў гэтым годзе складае 9,2 млн тон збожжа.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, генеральнаму дырэктару сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Хенкель Баўтэхнік» Навіцкаму Сяргею Рыгоравічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю БАЦЬКІ.**

■ У сучасным фармаце

# Аддзяленне, якога не хапала

## Для жыхароў Каменнай Горкі запрацавала новая пошта

**Аддзяленне паштовай сувязі, што адкрылася ўчора па адрасе Налібоцкая, 36, адносіцца да пошты новага фармату: яно ўжо трэцяе, якое знаходзіцца ў гандлёвым цэнтры.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Гэтым разам наяўнасцю пошты можа пахваліцца ГЦ «Квадра» (летась таксама былі адкрыты аддзяленні ў «Прасторы» на Прытыцкага і «Алмі» на Дзяржынскага). Тут працуюць два аператары, аддзяленне абсталявана сучаснай тэхнікай, ёсць плацежна-даведачны тэрмінал для аплаты паслуг без камісіі.

У кліенцкай зале наведвальнікі могуць атрымаць усе паштовыя, а таксама непрафільныя паслугі: выплата пенсій і дапамог, прыём пісьмовай карэспандэнцыі, пасылак, адпраўленняў паскоранай пошты EMS, грашовых пераводаў, адпраўленняў Netlіст і тэлеграм, падпіска на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, аплата камунальных паслуг і інш.

Прадстаўлены шырокі асартымент марак, паштовак, канвертаў, картак для посткросінгу, газет і часопісаў, можна набыць інтэрнэт-карты, электронныя пластыкавыя і сэрвісныя тэлефонныя карты, прапануюцца паслугі капіравання.

Сталічны мікрараён Каменная Горка імкліва расце, таму адкрыццё новага паштовага аб'екта дасць магчымасць зняць нагрузку з суседніх аддзяленняў і палепшыць якасць абслугоўвання кліентаў.

— Неўзабаве мы плануем адкрыць яшчэ два аддзяленні. Да Дня сувязі — у Лошыцы на вуліцы Шпілеўскага, — паведаміў **начальнік вытворчасці «Мінская пошта» Віктар БУТРЫМ *(на фота).***

Ён таксама расказаў, што на выставе «ТІВО-2016» вытворчасць прэзентуе «Пошту XXI стагоддзя», і ўсё, што там будзе заяўлена, рэалізуюць у мікрараёне Лебядзіны.

— Мы крыху папрацуем над інтэр'ерамі, дызайнам памяшканняў, адыдзем ад нейкіх старых шаблонаў. Зробім ухіл на самаабслугоўванне: там будуць не толькі інфакіёскі, а і прылады для адпраўкі паштовых адпраўленняў. Будзе шырока прадстаўлены кірмаш паштовай прадукцыі і самыя сучасныя тэхналагічныя рашэнні, якія сёння ёсць на пошце, — прыадкрыў інтрыгу начальнік вытворчасці.

Дарэчы, у аддзяленні на Налібоцкай тэхналагічна рэалізавана ўсё, што пералічыў Віктар Бутрым. Хіба што яно недаставачнае (гэта значыць, тут не працуюць паштальёны, бо месца не так шмат).

У дзень урачыстага адкрыцця аддзялення кліентам уручалі паштовыя сувеніры. Адна з першых наведвальніц Вольга Феактыстава разам з маленькім сынам Кірылам прыйшла спецыяльна.

— Мы вельмі рады, што тут адкрылася новае аддзяленне, яго вельмі не хапала. Поштай карыстаемся часта: адпраўляем лісты, атрымліваем пасылкі, а аддзяленні знаходзіліся далёка. Таму мы вельмі шчаслівыя, што тут, каля дома (мы жывём насупраць), з'явілася новая пошта.

Новае аддзяленне атрымала нумар 58, яно стане 23-м па ліку ў Фрунзенскім раёне і 118-м у Мінску. Працаваць яно будзе з панядзелка па пятніцу з 9.00 да 20.00, у суботу і нядзелю — з 10.00 да 20.00.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*seradzyuk@zviazda.by*

# УВАГА, ПРАМЫЯ ЛІНІІ

## Падатак на працэнты, нюансы арэнды кватэр і іншае

**12 красавіка**, у аўторак, у рэдакцыі газеты «Звязда» адбудзецца **«прамая лінія» з начальнікам галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Беларусі**

### Міхаілам Міхайлавічам РАСОЛЬКАМ

З першых дзён красавіка ў краіне пачалі дзейнічаць асобныя падпункты Дэкрэта кіраўніка дзяржавы №7 «Аб прыцягненні грашовых сродкаў ва ўклады (дэпазіты)», якія рэгулююць парадак падаткаабкладання даходаў па банкаўскіх укладах (дэпазітах), а таксама грашовых сродках, якія знаходзяцца на бягучым (разліковым) банкаўскім рахунку.

Пытанні, якія тычацца гэтых новых правілаў, нюансаў у падаткаабкладанні даходаў ад здачы кватэр у арэнду, а таксама ўсяго іншага, што звязана з падаткаабкладаннем фізічных асоб, можна будзе задаць **12 красавіка з 11 да 12 гадзін па тэлефоне (8-017) 287-18-71.**

## Аб тэхнічнай інвентарызацыі і зямельных пытаннях

**13 красавіка**, у сераду, у рэдакцыі газеты «Звязда» адбудзецца **«прамая лінія» са старшынёй Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі**

### Андрэем Анатолевічам ГАЕВЫМ

Такім чынам, новыя правілы тэхнічнай інвентарызацыі і праверкі характарыстык нерухомай маёмасці ўступілі ў сілу сёлета з першых дзён красавіка. Адпаведная Інструкцыя была зацверджана 24 сакавіка 2015 года пастановай Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь №11.

Пытанні, якія тычацца гэтых новых правілаў, нюансаў ацэнкі дамоў і зямельных участкаў, а таксама ўсяго іншага, што звязана з зямельнымі надзеламі фізічных асоб, можна будзе задаць **13 красавіка з 12 да 13 гадзін па тэлефоне (8-017) 287-18-71.**

Папярэдне свае пытанні можна пакінуць **па нумары (8-017) 287-17-51** альбо даслаць на **электронную пошту kurkach@zviazda.by** з пазнакай «Прамая лінія».

■ Адпачынак са смакам

# Хачапуры па-аджарску пад «Купалінку» па-беларуску

**У славутай гасціннасці грузінаў мы пераканаліся на Днях Батумі, што прайшлі ў Мінску. Народныя песні і танцы, грузінскае віно і традыцыйныя стравы аджарскай кухні... Апошнія можна было не толькі пакаштаваць, але і навучыцца гатаваць.**




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Я, у прыватнасці, прыняла ўдзел у майстар-класе па прыгатаванні хачапуры па-аджарску. Пад кіраўніцтвам грузінскага шэф-кухара Зураба мы раскатвалі дражджавое цеста, фармавалі з яго «лодачкі», начынялі іх імерэцінскім сырам і пасыпалі сулугуні. Потым ставілі ў духоўку. Праз хвілін 15 даставалі, вылівалі ў паглыбленне «лодачкі» жаўток яйка, клалі кавалачак масла. І зноў на хвіліну-дзве — у духоўку. Жаўток павінен быць усмятку!

Грузінская кухня славіцца разнастайнасцю рэцэптаў хачапуры. Аджарскі ж адрозніваецца як арыгінальнай формай, так і непаўторным смакам. «Калі іншыя віды хачапуры падаюць разам з чымсьці яшчэ, то гэты заўсёды ядуць асобна, — кажа шэф-кухар. — Лазы, якія жывуць на ўзбярэжжы Чорнага мора, надалі страве форму лодкі, а жаўток адлюстроўвае заход сонца, якое апускаецца ў мора».

Пакуль запякаліся хачапуры, усе ахвотныя змаглі паўдзельнічаць у майстар-класе па грузінскіх танцах, падзівіцца з «мцілуры» (славуты танец горцаў), пачуць «Суліко»... Прыемна здзівіў грузінскі хор, калі пачаў спяваць беларускую «Купалінку» практычна без акцэнту ***(відэазапіс можна паглядзець на сайце «Звязды»).***

З 6 па 9 красавіка ў сталічным выставачным цэнтры «БелЭкспа» праходзіць турыстычная выстава «Адпачынак-2016». Найбольшы ажыятаж — каля грузінскага стэнда. І не дзіўна. Штодзень у абедзенны перапынак там для гасцей выставы гатуюць аджарскі хачапуры, частуюць ім і расказваюць пра гісторыю стравы і традыцыі яе спажывання. Таму, калі вы яшчэ не вызначыліся, дзе правесці свой адпачынак, то абавязкова завітайце ў «БелЭкспа».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК**

# КОЛЬКАСЦЬ ВАЎКОЎ БУДЗЕ ЗМЕНШАНА

**Органы ўлады Нараўлянскага раёна нарэшце атрымалі дазвол ад Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя на адстрэл ваўкоў. Адбылося гэта пасля таго, як драпежнікі пачалі ажыццяўляць набегі на вёскі. Першы намеснік старшыні Нараўлянскага райвыканкама Наталля КОВАЛЬ паведаміла, што адстрэл дарослых ваўкоў паляўнічымі ў ахоўнай зоне Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка пачнецца ўжо сёння.**

Пакуль жа галодныя драпежнікі ноччу прыходзяць вялізнымі зграямі, нападаюць на прыватныя падворкі і забіваюць сабак. У вёсцы Кіраў, дзе загрызена 30 сабак, жыхары бачылі да 20 драпежнікаў. Вяскоўцы баяцца выходзіць на вуліцу і выпускаць з хаты дзяцей. Спецыяльныя патрулі, у складзе якіх супрацоўнікі МНС і МУС дапамагаюць абараніць людзей ад звяроў, але ваўчынае логава знаходзіцца дзесьці на мяжы з Украінай. А сыходзяць ваўкі ў Палескі радыяцыйна-экалагічны запаведнік, які зусім побач. Жывёлу мясцовыя жыхары надзейна хаваюць, цяпер і сабак пачалі заводзіць у дом на ноч.

Ваўкі ж вымушаны былі пашырыць зону пошуку ежы, бо ў навакольных лясах было знішчана пагалоўе дзіка — у сувязі з небяспекай распаўсюджвання эпідэміі афрыканскай чумы свіней. **Старшыня Гомельскага аддзялення Беларускага таварыства паляўнічых Сяргей МАРЧАНКА** пацвярджае, што небывалую агрэсію звера выклікаў голад:

— Гэта дзікая жывёла, якая ўсё адно жадае есці. І вось недахоп дзіка ў жывой прыродзе яго натуральна вядзе бліжэй да чалавека, дзе ён можа з'есці таго ж сабаку ці яшчэ кагосьці.

Без спецыяльнага дазволу на тэрыторыі шматкіламетровай закрытай чарнобыльскай зоны адстрэльваць драпежніка было строга забаронена. Страляць у звера, як і ставіць на яго пасткі, нельга і ў саміх населеных пунктах. **Старшыня Нараўлянскага раённага выканкама Валерый ШЛЯГА** адзначыў, што да гэтага быў атрыманы дазвол толькі на бязвзбройнае выняцце ваўка ва ўзросце да трох месяцаў. Жыхары ў сваю чаргу трымаюць напагатове вілы і рыдлёўкі. А яшчэ возяць з сабой лямпы, якімі можна сляпіць ваўка ў цемры. На ўскраінах на агародах развешваюць чырвоныя сцяжкі, за якія звер не заходзіць.

Нагадаем, што падобная сітуацыя, калі некалькі ваўкоў тэрарызавалі мясцовых жыхароў, адбылася ў вёсцы Краснае Брагінскага раёна ў 2013 годзе. Тады ўрэгуляваць сітуацыю атрымалася толькі з дапамогай паляўнічых.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

■ Праблема

# НАСВАЮ СТАВЯЦЬ ЗАСЛОНЫ

**У нашай краіне ўсур'ёз узяліся за барацьбу з некурыльнымі сумесямі. З 21 сакавіка па 1 красавіка супрацоўнікі міністэрстваў унутраных спраў і па падатках і зборах правялі комплекснае мерапрыемства. Мэта простая — выявіць, перакрыць нелегальны збыт насваю. Вынікі доўга чакаць не прымусілі.**

Як адзначыў **Васіль ЛОСІЧ, начальнік галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС,** за час акцыі выявілі 54 факты рэалізацыі і захоўвання некурыльных сумесяў. Канфіскавана 530 кілаграмаў! Гэтага хапіла б на 27 тысяч доз коштам звыш 668 мільёнаў рублёў. Што цікава, толькі за ўвесь 2013 год канфіскавалі 400 кілаграмаў насваю. Ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС паведамілі, што аб'ёмы паставак некурыльных сумесяў у нашу краіну пастаянна павялічваюцца. І за апошнія тры гады канфіскавана больш за 4,5 тоны гэтага рэчыва.

У выніку комплекснага мерапрыемства да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнулі 25 чалавек. Яшчэ каля трыццаці матэрыялаў для складання пратаколаў накіраваны ў тэрытарыяльныя падатковыя інспекцыі. Найбольшую колькасць насваю, амаль 380 кілаграмаў, канфіскавалі на Гродзеншчыне. Так, адзін з вадзіцеляў у складскім памяшканні захоўваў 260 кілаграмаў некурыльных сумесяў.

Нядаўна, пасля вынікаў грамадскага абмеркавання лібералізацыі адміністрацыйнага заканадаўства, МУС прыняло рашэнне ініцыяваць увядзенне адказнасці за захоўванне, спажыванне, рэалізацыю насваю.

**Якаў ЖУРБІН**

# «Сусед» насамрэч быў зладзюжкам

## А ўсяго толькі і патрабавалася, што даведацца код дамафона

**Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Кастрычніцкага РУУС сталіцы па падазрэнні ў здзяйсненні серыі крадзяжоў затрымалі 23-гадовага жыхара Рэчыцы. «Гастралёр» дзейнічаў па простай схеме, пазбаўляючы асабістых рэчаў насельнікаў хостэла.**

У аператыўна-дзяжурную службу звярнулася замежная грамадзянка, якая патлумачыла, што ў хостэле, дзе яна спынілася, у яе ўкралі дарагі планшэт і фотаапарат. На месцы здарэння высветлілася, што некалькі тыдняў таму па гэтым жа адрасе была скрадзена маёмасць у іншага пастаяльца. Калі аператыўнікі апытвалі сведак, зламыснік... вярнуўся на месца злачынства, дзе і патрапіў у рукі праваахоўнікаў. Цяпер хлопец падазраецца ў пяці крадзяжах асабістай маёмасці грамадзян на тэрыторыі сталіцы. Дзейнічаў па простай схеме. Наведвальнікі, аплаційшы паслугі, выпраўляліся ў чатырохпакаёвую кватэру, якая размяшчалася ў асобным пад'ездзе і зачынялася на кодавы замок дамафона. Дзверы ж уласна жылля былі незачыненымі, вахцёра ці адміністратара не было. Кліентам работнікі хостэла паведамлялі код дамафона, чым і скарыстаўся «гастралёр», які падглядзеў яго ў аднаго з пастаяльцаў на паперцы. Людзі, што засяляліся ў адзін з пакояў, не ведалі, хто жыве побач і ці на законных падставах ён знаходзіцца па суседстве.

# «Пажартаваў» з бомбай

**На станцыі «Кастрычніцкая» сталічнай падземкі 59-гадовы мужчына заведама ілжыва паведаміў супрацоўніку міліцыі, што ў яго ў пакеце знаходзіцца... бомба.**

Заяўніка тут жа даставілі ў пакой міліцыі для разбору. У выніку высветлілася, што ніякага выбуховага ўстройства ў яго няма, проста мужчына вырашыў так пажартаваць. Аднак жарт можа дорага абысціся — Ленінскі раённы аддзел Следчага камітэта ўжо завёў крымінальную справу за заведама ілжывае паведамленне пра небяспеку. Мужчыну пагражае пакаранне ўключна да пазбаўлення волі тэрмінам на пяць гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# СЕЗОН ПАЛЯВАННЯ НА ДАЧЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У гэтым выпадку людзі разумеюць, што на зямлі сябе і дзяцей працай будзе пракарміць.

Зразумела, што самыя танныя прапановы прыпадаюць на садовыя домікі ў таварыствах і жылыя дамы ў вёсках, калі такія аб'екты знаходзяцца крыху збоку ад папулярных напрамкаў і размешчаны далей ад сталіцы. Напрыклад, даволі трывалы жылы дом пад Барысавам на адлегласці каля 80 кіламетраў ад Мінска прадаецца толькі за 90 млн рублёў. Калі ўлічваць, што прадаўцы цяпер ахвотна згаджаюцца на зніжкі, тады падобнае жыллё магчыма набыць па кошце і ўвогуле да 4 тысяч долараў.

Гэтай вясной добрым попытам карыстаюцца дачы недалёка ад Маладзечна. Самы слабенькі ў плане плошчы і якасці садовы домік у гэтым напрамку прапануецца ўсяго за 57 млн рублёў. Садовы домік сярэдняй камфортнасці недалёка ад Маладечна і побач з вадаёмам выстаўлены на продаж ужо за 160 млн рублёў.

Існуюць не вельмі дарагія дачы і па Ракаўскім напрамку. Міні-домік на адлегласці каля 40 кіламетраў ад МКАД прапануецца толькі за 115 млн рублёў. Тут, праўда, гаспадар нерухомасці адзначае, што сама пабудова патрабуе рамонту.

## КРЫХУ БЛІЖЭЙ — І ЎЖО ДАРАЖЭЙ

**Дырэктар агенцтва нерухомасці «Загарадны дом і Кватэрны цэнтр» Уладзімір ЧАРНУШЭВІЧ** адзначае, што актыўнасць патэнцыяльных пакупнікоў пачала павялічвацца ўжо напрыканцы сакавіка. А за мінулыя выхадныя ў агенцтва было ўжо больш за 20 званкоў наконт дач. Самы запатрабаваны напрамак — Пухавіцкі, у прыватнасці — на тэрыторыі садаводчага таварыства «Шарык», дзе будаваліся супрацоўнікі Мінскага падшыпнікавага завода.

Сярэдняя плошча зямельных участкаў у гэтым СТ складае 4-7 сотак, на якіх пабудаваны невялікія хаткі. Цэнавы дыяпазон падобных дач складае 5-10 тысяч долараў. Напрыклад, цяпер у СТ «Шарык» зборна-шчытавы домік на 7 сотках зямлі гаспадары выставілі на продаж за 7 тысяч долараў. У аб'яве таксама сказана, што побач з участкам размешчаны лес і рака.

Можна падабраць сезоннае жыллё і па Брэсцкім напрамку. Ёсць там і ўвогуле бюджэтныя варыянты. Напрыклад, за 14 кіламетраў ад МКАД цяпер прапануюць дом у дачным кааператыве «Палёт» за 7,5 тысячы долараў. Праўда, пабудова там невялікая — на ўсё каля 30 квадратных метраў, а сам участак — 5,4 соткі.

## ЛЕПШ АДРАЗУ ВЫСТАЎЛЯЦЬ РЫНКАВЫ КОШТ

Наш эксперт упэўнены, што сёння хутчэй прадаецца той аб'ект, які адразу прапануецца па рэальным цэнніку. Сапраўды ліквіднымі ў пакупнікоў лічацца дачы з цэнавым дыяпазонам ад 10 да 20 тысяч долараў, якія размешчаны ў межах 20 кіламетраў ад Мінска.

А такіх варыянтаў у базах цяпер нямала. Напрыклад, за 20 кіламетраў ад МКАД у маскоўскім напрамку прадаецца дом у Дамашанах за 13,5 тысячы долараў. У аб'яве сказана, што гэты драўляны дом быў пабудаваны ў 2012 годзе. З камунікацый у ім толькі электрычнасць і сезонная вада, а ўчастак — каля 6 сотак.

**У цэнавым дыяпазоне ад 20 да 30 тысяч долараў гаспадары прапануюць домікі, якія, хутчэй, можна аднесці да катэгорыі катэджаў.**

Карыстаюцца попытам і якасныя садовыя домікі недалёка ад Маладзечна. Напрыклад, дача за 17 кіламетраў ад МКАД прадаецца за 18 тысяч долараў. Дом цагляны ў два ўзроўні, участак 9,5 соткі, пяць з іх гаспадары пазначылі як «пад бульбу». Таксама прадавец паказаў, што побач з домам размешчаны лес і вадаём.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Увогуле, дачы, якія размешчаны бліжэй да Мінска, прадаюцца звычайна без істотных зніжак і даволі хутка. І гэта пры тым, што на некаторыя варыянты цана засталася амаль на мінулагоднім узроўні. У цэлым жа «фазэнды» сярэдняй якасці за год патаннелі недзе на 10-20%, лічыць Уладзімір Чарнушэвіч. Ёсць пакупнікі і на больш дарагія аб'екты, але і патрабаванні да іх ужо значна вышэйшыя.

У цэнавым дыяпазоне ад 20 да 30 тысяч долараў гаспадары прапануюць домікі, якія, хутчэй, можна аднесці да катэгорыі катэджаў. У комплексе такой нерухомасці павінен быць і дагледжаны ўчастак, і ўтульнае месца для адпачынку. Так, за 23 тысячы долараў цяпер можна набыць даволі камфортную дачу за 16 кіламетраў ад Мінска. Там будзе драўляны дом, абабіты сайдынгам. На ўчастку ў 5 сотак размешчаны таксама хлеў, летняя кухня, душ і прыбіральня з мясцовай каналізацыяй, пляцоўка для стаянкі аўто, а насупраць — лес.

## У ЯКАСЦІ ЗАПАСНОГА АЭРАДРОМА

Эксперты загараднай нерухомасці адзначаюць, што асобная катэгорыя пакупнікоў цікавіцца дамамі менавіта ў вёсцы. Ім важней 15 сотак зямлі замест дачных шасці, а таксама наяўнасць сталых суседзяў. Самымі папулярнымі варыянтамі для іх будуць дамы, якія размешчаны ў межах 30 кіламетраў ад Мінска з камунікацыямі і па кошце да 30 тысяч долараў. Калі ў людзей ёсць свабодныя грошы, то такі аб'ект разглядаецца як своеасаблівае «запасное» жыллё на потым.

Таксама ёсць попыт і на дамы, што размешчаны на ўскраіне вёсак, у адасобленым месцы з блізкасцю да лесу і возера. Такі мікрапрыродны заказнік для асобнай сям'і. Аднак такія месцы былі амаль цалкам распрададзены яшчэ ў 90-я гады.

Акрамя гэтага, людзі сталі ўзважваць свае пакупкі. Раней не глядзелі на адлегласці, галоўнае, каб месца было маляўнічае. А цяпер лічаць і кіламетры, і амартызацыю аўтамабіля — усе сталі рэалістамі. Дача купляецца ўжо для пражывання і забеспячэння сям'і экалагічнымі прадуктамі.

## САМЫ БЮДЖЭТНЫ ВАРЫЯНТ

Для тых, у каго фінансавыя накапленні сапраўды абмежаваныя, можна прапанаваць увогуле цалкам бюджэтны варыянт загараднага аб'екта. Цяпер у садовых таварыствах (за выключэннем прыгараднай зоны сталіцы і абласных цэнтраў) існуюць дачы з мінімальным наборам пабудоў. Па сутнасці, прадаецца не сама дача як жылы аб'ект, а зямельны ўчастак, прадаецца месца.

Калі садовае таварыства мае «прапіску» ў адлегласці каля 70-100 кіламетраў ад сталіцы, то слабенькая дача з хлеўчыкам будзе каштаваць там капейкі. Але ў гэтым выпадку неабходна будзе самастойна пабудаваць нейкае сезоннае жыллё.

А сёння праблем з гэтым ужо няма. У продажы хапае мноства варыянтаў зборных домікаў, якія прапануюцца спажыўцам замежнымі і айчыннымі вытворцамі. Так, камплект шчытавога доміка з элементамі бруса, памерам 3 м на 3 м з адным акном можна купіць за 15 млн рублёў. Крыху большы зборны садовы домік (3,8 м на 4,8 м) каштуе ўжо каля 28 млн рублёў.

Зразумела, што такія міні-хаткі разлічаны не на вялікую сям'ю, аднак два чалавекі ў першай, а тры — у другой змяшчаюцца лёгка.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

---

Г О Д О В О Й   О Т Ч Е Т   Э М И Т Е Н Т А   Ц Е Н Н Ы Х   Б У М А Г

## ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»

**231300, Гродненская обл., г. Лида, ул. Советская, 70, УНП 500021638**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2015 г.

| АКТИВЫ | Код стр. | На 31 декабря 2015 г. | На 31 декабря 2014 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 271 476 | 242 790 |
| Нематериальные активы | 120 | 2 417 | 2 352 |
| **Доходные вложения в материальные активы** | **130** | **-** | **-** |
| В том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 100 782 | 88 308 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 114 582 | 114 583 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| в том числе аккредитивы | 171 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **489 257** | **448 033** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | **210** | **275 106** | **214 515** |
| В том числе: | | | |
| материалы | 211 | 76 581 | 44 154 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | 19 506 | 30 931 |
| готовая продукция и товары | 214 | 164 325 | 124 736 |
| товары отгруженные | 215 | 14 694 | 14 694 |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 766 | 1 057 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 1 650 | 20 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 78 331 | 101 682 |
| в том числе аккредитивы | 251 | - | - |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 1 242 | 980 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 18 860 | 28 546 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 1 787 | 30 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **377 742** | **346 830** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **866 999** | **794 863** |

| Собственный капитал и обязательства | Код стр. | На 31 декабря 2015 г. | На 31 декабря 2014 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 181 739 | 175 832 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 5 250 | 5 229 |
| Добавочный капитал | 450 | 246 264 | 247 282 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 39 636 | 71 123 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного года | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **472 889** | **499 466** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 190 547 | 153 757 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **190 547** | **153 757** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 56 964 | 31 688 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| **Краткосрочная кредиторская задолженность** | **630** | **146 599** | **109 935** |
| В том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 75 131 | 81 144 |
| по авансам полученным | 632 | 42 431 | 4 581 |
| по налогам и сборам | 633 | 2 797 | 4 470 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 1 387 | 1 386 |
| по оплате труда | 635 | 4 769 | 3 734 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам ) | 637 | 4 206 | 11 163 |
| прочим кредиторам | 638 | 15 878 | 3 457 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | 17 |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **203 563** | **141 640** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **866 999** | **794 863** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2015 г.

| Наименование показателей | Код стр. | За январь-декабрь 2015 г. | За январь-декабрь 2014 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 384 511 | 489 576 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | ( 313 734) | ( 384 816) |
| **Валовая прибыль (010-020)** | **030** | **70 777** | **104 760** |
| Управленческие расходы | 040 | ( 21 649) | ( 23 077) |
| Расходы на реализацию | 050 | ( 18 465) | ( 22 171) |
| **Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)** | **060** | **30 663** | **59 512** |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 12 061 | 79 092 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | ( 21 969) | ( 88 651) |
| **Прибыль (убыток) от текущей деятельности (060+070-080)** | **090** | **20 755** | **49 953** |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 4 863 | 7 096 |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 386 | 130 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 4 351 | 6 852 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 126 | 114 |
| **Расходы по инвестиционной деятельности** | **110** | **( 1 031)** | **( 323)** |
| В том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | ( 913) | ( 216) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | ( 118) | ( 107) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 63 633 | 40 375 |
| В том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 63 633 | 40 375 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | - |

| Наименование показателей | Код стр. | За январь-декабрь 2015 г. | За январь-декабрь 2014 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | ( 121 357) | ( 71 524) |
| В том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | ( 23 137) | ( 21 783) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | ( 98 220) | ( 49 741) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | - | - |
| **Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100-110+120-130)** | **140** | **( 53 892)** | **( 24 376)** |
| **Прибыль (убыток) до налогообложения (090+140)** | **150** | **( 33 137)** | **25 577** |
| Налог на прибыль | 160 | - | ( 5 528) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | 2 263 |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | ( 1 667) |
| **Чистая прибыль (убыток) (150-160+170+180-190-200)** | **210** | **( 33 137)** | **20 645** |
| Количество прибыльных организаций | 211 | - | 1 |
| Сумма прибыли | 212 | - | 20 645 |
| Количество убыточных организаций | 213 | 1 | - |
| Сумма убытка | 214 | ( 33 137) | - |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| **Совокупная прибыль (убыток) (210+220+230)** | **240** | **( 33 137)** | **20 645** |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию, рублей | 250 | ( 7 043) | 4 815 |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию, рублей | 260 | - | - |

**4. Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %): 97,643**

**5-6. Информация о дивидендах и акциях**

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 1860 | 1860 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 3 | 3 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | | |
| в том числе: физических лиц | лиц | 1857 | 1857 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 7 | 7 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 0 | 4703 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 4633 | 6188 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 0 | 1016,52 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) | рублей | 983,48 | 1545,56 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тысяч рублей | 98,88 | 107,95 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 0 | 0 |

**7,8. Отдельные финансовые результаты**

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | миллионов рублей | 384511 | 489576 |
| Себестоимость реал. продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | миллионов рублей | 353848 | 430064 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения, всего | миллионов рублей | -33137 | 25577 |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | миллионов рублей | 30663 | 59512 |
| в том числе: прочие доходы и расходы по текущей деятельности | миллионов рублей | -9908 | -9559 |
| в том числе: прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | миллионов рублей | -53892 | -24376 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | миллионов рублей | 0 | 4932 |
| Чистая прибыль (убыток) | миллионов рублей | -33137 | 20645 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | миллионов рублей | 39636 | 71123 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | миллионов рублей | 0 | 0 |
| Долгосрочные обязательства | миллионов рублей | 190547 | 153757 |
| Среднесписочная численность работающих | человек | 888 | 827 |

**9.** Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): производство сельхозмашин – 22%, производство радиаторов – 56%.

**12.** Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: 31 марта 2016 года.

**15.** Сведения о применении эмитентом свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета): нет

**Генеральный директор Ю.Э. Вашкевич Главный бухгалтер Т.Я. Жук**

■ Сфера паслуг

# БОЛЬШ ЗА ЛОЖАК І СНЯДАНАК

## Прыдарожнаму сэрвісу цяпер недастаткова забяспечыць начлег і харчаванне



**Для краіны, якая валодае транзітным патэнцыялам, вельмі важныя якасць дарог і паслуг для тых, хто па іх ездзіць. Гэта дазваляе прыцягнуць у эканоміку дадатковыя сродкі. Аднак калі кіроўца выбірае паміж двума роўнымі па суме ўсіх «за» і «супраць» маршрутамі, вызначальную ролю можа сыграць не толькі зручнасць прыпынкаў для адпачынку і запраўкі палівам, але і ўражанне, якое пакідае прыдарожная кавярня або гасцініца. Вось чаму на Міншчыне ўладальнікі такіх аб'ектаў змагаюцца не проста за кліентаў, але за іх настрой.**

Нядаўна тыя, хто ехаў па трасе М1 — Е30 у 50 кіламетрах ад расійскай мяжы, што ў бок Смаленска, мог назіраць незвычайную карціну. На прыступках кафэ «Пліса» ў Крупскім раёне жанчыны і мужчыны ў нацыянальных строях спявалі песні і запрашалі пакаштаваць беларускія стравы, а заадно і пазнаёміцца з выстаўкай, што размешчана тут жа.

— Гэта работы нашых умельцаў, — тлумачыла **дырэктар раённага Дома рамёстваў горада Крупкі Таццяна СУХАПЛЮЕВА** журналістам. — З нядаўняга часу мы пачалі выстаўляць тут невялікую частку сваіх твораў. Такім чынам хочам паказаць гасцям, наколькі багаты на таленты наш край. Гэта дазваляе не толькі рэкламаваць сваю прадукцыю, але і знаёміць турыстаў з культурай, традыцыямі як Крупшчыны, так і Беларусі. Для нас важна прадбачыць жаданне турыста, які праязджае па дарозе. І даць яму тое, што ён жадае. Напрыклад, хтосьці не паспеў купіць падарунак ці сувенір для сваіх блізкіх. Калі ласка, іх прапануюць аб'екты прыдарожнага сэрвісу нашага раёна. У кагосьці дрэнны настрой, паколькі не можа звязацца са сваякамі — скончылася зарадка мабільніка. Мы дапаможам яму вырашыць праблему: не толькі зарадзіць тэлефон, але і звязацца па інтэрнэце з неабходным адрасатам, — падтрымлівае размову **намеснік старшыні Крупскага райвыканкама па эканоміцы Юлія КАМАРОВА.**

У раёне налічваецца 10 аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу, у тым ліку дзве аўтазаправачныя станцыі з магазінам і кафетэрыем, а таксама некалькі кавярняў.

— Па колькасці аб'ектаў харчавання на рэспубліканскіх дарогах мы дасягнулі нарматыву. Аптымальныя суадносіны: адзін пункт на 30 кіламетраў. У нас жа на адрэзку аўтамагістралі М1 — Е30 Брэст — Мінск — мяжа Расійскай Федэрацыі, што праходзіць праз раён, на працягу 37 кіламетраў знаходзіцца тры аб'екты грамадскага харчавання. Акрамя таго, на гэтым участку дарогі размешчаны дзве аўтамабільныя стаянкі. Яны абсталяваны летнімі альтанкамі, бясплатнымі прыбіральнямі, дзіцячымі пляцоўкамі, — канстатуе Юлія Мікалаеўна.

У пунктах грамадскага харчавання можна не толькі падсілкавацца, але і адпачыць у гасцінічных нумарах, набыць сувеніры. Тут устаноўлены тэрміналы для безнаяўнага разліку за паслугі і тавары, праведзены інтэрнэт, падключаны тэлебачанне, тэлефонная сувязь, ёсць магчымасць зарадзіць мабільны тэлефон і іншыя гаджэты. Каля кожнага аб'екта грамадскага харчавання ёсць месцы для паркоўкі аўтатранспарту, у тым ліку для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

— Сёлета плануецца здаць у дзеянне яшчэ адну прыдарожную кавярню на 40 пасадачных месцаў. Разам з тым падабрана больш як 20 зямельных участкаў, якія будуць выстаўляцца на аўкцыён на права заключэння дагавораў арэнды для будаўніцтва аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу, — падкрэсліла спецыяліст.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

### У ТЭМУ

**Таццяна ШАЎЦОВА, начальнік упраўлення гандлю Мінаблвыканкама:**

— Усяго на тэрыторыі Мінскай вобласці налічваецца 173 аб'екты грамадскага харчавання прыдарожнага сэрвісу, сярод іх 43, або 25% ад агульнай колькасці, належаць «Белнафтахіму», 23 (13%) — «Белкаапсаюзу», 104 (60%) — індывідуальным прадпрымальнікам.

Толькі ў мінулым годзе адкрыта 10 такіх пунктаў на 275 пасадачных месцаў у Нясвіжскім, Дзяржынскім, Уздзенскім, Мінскім, Вілейскім раёнах, у тым ліку чатыры — пры аўтазаправачных станцыях.

У кавярнях, міні-кафэ, рэстаранах, што месцяцца на аўтадарогах, пастаянна прымаюцца захады па паляпшэнні якасці абслугоўвання. У 172 пунктах устаноўлена тэрміналнае абсталяванне для безнаяўнага разліку за тавары і паслугі, распрацавана меню на адной з замежных моў, прапануюцца слоўнікі-размоўнікі для замежных гасцей. 133 аб'екты грамадскага харчавання (76,8%) забяспечаны падключэннем да бяспроваднай сеткі Wi-Fi, 159 (92%) абсталяваны сродкамі відэаназірання.

Асаблівую ўвагу надаём стварэнню безбар'ернага асяроддзя і ўмоў беспераШкоднага перасоўвання і доступу ў аб'екты прыдарожнага сэрвісу людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У прыватнасці, 128 з іх (74%) забяспечаны пандусамі, поручнямі. На аўтастаянках у 116 (67%) пунктах грамадскага харчавання абазначаны спецыяльныя месцы для паркоўкі аўтамабіляў для інвалідаў.

■ ЗаканаТворчасць

# І ЛЮДЗЯМ, І ПРЫРОДЗЕ

## Унесены змены і дапаўненні ў Закон «Аб абароне раслін»



**Хімічныя сродкі для апрацоўкі раслін не павінны шкодзіць экалогіі. У той жа час пакуль не вынайдзена панацэй, якая абараняла б расліны і была на ўсе 100% бясшкоднай для чалавека. Ужо падчас першага пасяджэння вясновай сесіі Палаты прадстаўнікоў дэпутаты прынялі ў першым чытанні праект закона, што ўносіць змены і дапаўненні ў Закон «Аб абароне раслін». Чаму ён не прадугледжвае ніякіх палажэнняў для вядзення экалагічнай сельскай гаспадаркі? Якім чынам законапраект абароніць інтарэсы спажыўцоў? Ці змяшчае ён механізмы супраць увозу да нас такіх шкодных раслін, як баршчэўнік? На ўсе гэтыя пытанні «Звяздзе» адказаў Міхаіл ВОЛКАЎ, член Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы.**

— Закон прымаецца для сельскагаспадарчых культур, — заўважае дэпутат у пачатку нашай размовы. — Але мы не можам размяжоўваць сельскагаспадарчыя і іншыя культуры, калі гаворка ідзе пра тое, каб да нас не ўвезлі нейкія шкодныя расліны. У гэтым выпадку, натуральна, закон ахоплівае ўсе расліны.

### Каларадскі жук — не самае горшае

У новай рэдакцыі закона ёсць такое паняцце, як «эканамічны парог шкоднасці».

— Гэта вельмі важны тэрмін, — звяртае ўвагу куратар законапраекта. — Трэба ўстанавіць мяжу, пасля якой гаспадарцы наносіцца эканамічная шкода з-за пэўнага арганізма.

На пытанне, ці можна да самых небяспечных для сельскай гаспадаркі шкоднікаў аднесці легендарнага каларадскага жука, дэпутат адказвае адмоўна:

— Каларадскі жук сёння ўжо не самая вялікая праблема. Цяпер ёсць эфектыўныя сродкі абароны раслін ад яго.

На жаль, значна горшы стан спраў з баршчэўнікам Сасноўскага. Яго радзіма — Закаўказзе, а да нас яго прывезлі яшчэ ў савецкія часы прадстаўнікі сельскагаспадарчай галіны — для вывучэння.

— Гэтая расліна дае вялікую зялёную масу, і яе завезлі з мэтай атрымання корму для жывёл, — узгадвае Міхаіл Волкаў. — У інстытуце была невялікая дзялянка гэтага баршчэўніка. З развалам Савецкага Саюза пра яго, відаць, забыліся. У выніку баршчэўнік стаў прычынай своеасаблівага прыроднага катаклізму. Гэта прыклад неабдуманага ўмяшання чалавека ў прыроду. Калі такая расліна расце ў сваім «месцы жыхарства», у яе ёсць натуральныя «ворагі». Але калі яна трапляе ў больш спрыяльныя ўмовы, атрымліваецца якраз тое, што выйшла ў нас.

Баршчэўнік самы вядомы сярод шкодных раслін, што растуць у Беларусі. У Віцебскай вобласці, дзе ён стаў сапраўдный эпідэміяй, прынята цэлая праграма барацьбы з ім. Расліна гэтая вельмі цікавая ў тым плане, што пакуль яна не дасць насення, будзе ўвесь час адрастаць, якой бы атрутай яе ні травілі. Калі ж насенне выспявае, баршчэўнік гіне сам па сабе.

### Абараніць спажыўца

У новай рэдакцыі значная ўвага надаецца правам спажыўца. Па словах майго суразмоўцы, трэба разумець, што сёння асноўныя сродкі абароны раслін — хімічныя. А гэта небяспечныя прэпараты.

— Уводзяцца пэўныя ўмовы, пры якіх дазваляецца продаж сродкаў абароны раслін юрыдычным і фізічным асобам, — адзначае Міхаіл Волкаў. — На этыкетцы павінна быць змешчана інфармацыя, як прымяняць той ці іншы хімікат, у якіх дозах. Павінны быць суправаджальныя дакументы. Трэба, каб спажыўцу прадастаўлялася поўная інфармацыя.

Увоз сродкаў абароны раслін на тэрыторыю нашай краіны будзе здзяйсняцца толькі па ліцэнзіі, выдадзенай упаўнаважаным дзяржаўным органам.

— Такім чынам мы хочам адсеяць фірмы-аднадзёнкі, якія распаўсюджваюць небяспечныя сродкі абароны прадукцыі, якую мы потым ужываем у ежу, — тлумачыць парламентарый. — Ліцэнзаванне ўводзіцца і для аптовага гандлю сродкамі абароны раслін. На нашу думку, гэта будзе садзейнічаць развіццю здаровай канкурэнцыі. Каб атрымаць ліцэнзію, трэба добрасумленна працаваць.

Дэпутат адзначае, што пакуль ліцэнзія патрэбна для распаўсюджвання медыцынскіх і ветэрынарных прэпаратаў. Продаж сельскагаспадарчай прадукцыі не ліцэнзуецца.

— Але сродкі абароны раслін часам бываюць нашмат больш атрутныя, чым медыцынскія або ветэрынарныя прэпараты, — заўважае ён. — У праекце закона мы абараняем і насельніцтва, і прыроду.

Вядома, што некаторыя сродкі для апрацоўкі сельскагаспадарчых раслін шкодныя для жывёл. Мыш жыве на кукурузным полі, што апрацавана хімікатам, і харчуецца там жа. Ліса з'ядае атрутную мыш — і паміраe. Гэта, многія лічаць, адна з асноўных прычын, чаму папуляцыя ліс у нашых лясах зменшылася.

— Такое адбываецца з-за парушэння тэхналогіі, — тлумачыць дэпутат. — Калі ўсё робіцца па правілах, то прэпараты бяспечныя для ўсіх, акрамя тых, супраць каго яны распрацаваныя. Хімікаты апрабоўваюцца падчас лабараторных даследаванняў, якія даказваюць, што таксічнасць прэпарата не пагражае цеплакроўным.

### Пра арганічную гаспадарку гаварыць рана

У апошнія гады шмат гавораць пра так званую арганічную сельскую гаспадарку. Пры выкарыстанні якіх бы то ні было хімікатаў яе вядзенне ўвогуле немагчымае. Аднак праект закона не прадугледжвае нейкіх адмысловых сродкаў абароны раслін, якія можна было б выкарыстоўваць для экалагічнай сельскай гаспадаркі.

— У нашай краіне вельмі інтэнсіўная сельская гаспадарка, і без хімічных і бактэрыялагічных сродкаў немагчыма абысціся. Арганічнае земляробства ў нас прысутнічае ў невялікіх маштабах — ім займаюцца, як правіла, фермеры. Таму няма неабходнасці распрацоўваць спецыяльныя заканадаўчыя нарматывы, — лічыць дэпутат.

Увогуле ж, на думку парламентарыя, арганічная сельская гаспадарка — добрая і цікавая ідэя, якая мае права на развіццё.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*


## Извещение об открытом аукционе по продаже конфискованного имущества 12 мая 2016 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Начальная цена с НДС (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Условия продажи | Характеристика объекта |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1*. | Капитальное строение 400/С-80170 здание одноквартирного жилого дома | Гродненская область, Гродненский район, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Семейная, д. 14 | 3 606 000 000 | 360 600 000 | Без условий | Здание расположено на земельном участке общей площадью 0,1493 га с кадастровым номером 422000000004000172. Общая площадь здания 237,3 кв.м, год постройки 2013. Количество комнат – 4, кухня, 3 санузла, встроенная мебель, топочная. Летняя кухня (76 кв.м.) с верандой, гараж пристроен к дому, ворота металлические, калитка металлическая, забор кирпичный протяженностью 319 кв.м, тротуарная плитка 480 кв.м., бордюрный камень протяженность 270 м, водосток тротуарный 30 м, плитка на пороге у входной двери 4,32 кв.м |
| 2*. | Земельный участок для ведения коллективного садоводства | Гродненская область, Гродненский район, Подлабенский с/с, СТ «Богатыри Польные», д. 108 | 16 330 000 | 1 633 000 | Без условий | Земельный участок общей площадью 0,0776 га с кадастровым номером 422080400083000004. Участок ровный, не облагорожен. Имеется подвод линии электропередачи, щит для подключения |

** – Лот продается по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Гродненском райисполкоме.*

**Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет №57, тел.: (0152) 720537, 720546.**

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10%.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале №400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

- **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условием на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли- продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона в течение 3-х рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

**Аукцион состоится 12 мая 2016 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет №57, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **с 11 апреля по 4 мая 2016 года.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720537, 720546. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by.**

# УЧАРАШНІЯ ШКОЛЬНІКІ, РАБОЧЫЯ І КІРАЎНІКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яе прыяцелька Дар'я па спецыяльнасці швачка, два гады адвучылася ў каледжы. Вакансій па яе профілі хапае, і канкурэнцыя невялікая: на 86 месцаў у горадзе прэтэндуе 26 чалавек. Праўда, дзяўчына бегаць па субяседаваннях не спяшаецца.

— Заробкі па гэтых вакансіях — 4-5 мільёнаў. Хацелася б 6. Мне далі дзесяць паперак з накіраваннем на прадпрыемствы, трэба паездзіць, — з неахвотай заўважае нядаўняя навучэнка.

32-гадовая Вольга, інжынер-эканаміст-транспартнік, не можа знайсці працу ўжо больш за паўгода. «Я з задавальненнем уладкавалася б па дагаворы падраду, на пару месяцаў — такіх прапаноў цяпер шмат. Хоць штосьці зарабляла б. Але ж, каб не лічыцца ўтрыманцам, трэба або адпрацаваць не менш за 183 дні ў годзе, або мець даход за год пад 15 мільёнаў. Складана праліčыць, ці ўдасца столькі атрымаць на дагаворах падраду. Даводзіцца адмаўляцца ад прапаноў, рэгістравацца беспрацоўнай, — дзеліцца праблемай жанчына. — Лепш бы я не стаяла на ўліку і не атрымлівала дапамогу па беспрацоўі, а шукала самастойна месца. Так боўтацца доўга можна».

Вольга спрабуе ўладкавацца праз службу занятасці, бо ў іх інфармацыя пра вакансіі больш дакладная. У інтэрнэце, прызнаецца, шмат арганізацый, што выстаўляюць прапановы, знаходзяцца ў «чорных» спісах: дрэнныя водгукі пра іх пакідаюць падманутыя саіскальнікі. Падазроныя вакансіі вылічыць нескладана. Такія аб'явы доўга вісяць, хоць наймальнікі абяцаюць добрыя грошы і офіс у цэнтры горада.

Заяўленыя заробкі, дарэчы, часта не адпавядаюць рэальным.

— У вакансіі пішуць, што будуць плаціць 4,5 мільёна, прыязджаеш на месца — аказваецца, на мільён менш. Бо на тым прадпрыемстве без прэміі ўжо год сядзяць, — тлумачыць Вольга.

## АДМАЎЛЯЮЦЬ ПРАЗ УЗРОСТ

Саіскальніца Святлана хоць і мае дыплом інжынера, але кім толькі ні працавала. Была яна і загадчыцай гаспадаркі ў дзіцячым садку, і пакаёўкай у гасцініцы.

— У дзіцячым садку толькі на пару месяцаў затрымалася. Не змагла больш.Там рэчы са склада зніклі — і папера туалетная прападала, і прадукты... Усё прасілі спісваць, — абураецца жанчына. — Пакаёўкай таксама доўга не папрацуеш. У мяне на хімікаты алергія пачалася. Пакуль яшчэ не звальнялася, але новае месца ўжо шукаю.

Жанчына скардзіцца, што, нават калі вакансія занесена ў базу, гэта яшчэ не значыць, што месца свабоднае. «Колькі разоў было: тэлефаную, а мне кажуць, што ўжо ўзялі чалавека».

Мінчанка спадзяецца ўладкавацца загадчыцай гаспадаркі ці адміністратарам. Тым больш вопыт маецца. Ёсць, праўда, адна праблема — узрост. Наймальнікі, калі чуюць, што Святлане 51 год, адразу адмаўляюць і больш нічога не распытваюць. Па статыстыцы, дарэчы, найбольшы працэнт беспрацоўных — менавіта людзі ва ўзросце 50-54 гадоў.

А вось Дзмітрый упэўнены: працу ён знойдзе хутка. За тыдзень малады чалавек паспеў схадзіць на некалькі субяседаванняў і яшчэ на тры атрымаў запрашэнні.

— Дагэтуль быў начальнікам вытворчасці на прыватным прадпрыемстве, якое вырабляла элітную мэблю і дзверы. А цяпер фірма закрываецца, — распавядае Дзмітрый пра папярэднюю пасаду.

Асноўны «інструмент» пошуку працы для хлопца — мабільны дадатак. Дзмітрый паказвае нам свой акаўнт: там бачна, колькі чалавек пракглядзелі яго рэзюмэ, хто з наймальнікаў адмовіў у працы, а хто яшчэ разглядае яго кандыдатуру. Інжынер-тэхнолаг з вышэйшай адукацыяй прывык да добрых заробкаў: лятась на фірме было шмат заказаў, таму і плацілі 1000-1200 долараў у месяц. Цяпер хлопец разглядае вакансіі з прапановамі і ў сем мільёнаў.



Фота Надзеі БУЖАН.

**Галоўны спецыяліст камітэта Ірына КАРНІЦКАЯ шукае, што прапанаваць беспрацоўнаму.**

## ПРАДПРЫЕМСТВЫ ХОЧУЦЬ ПРАФЕСІЯНАЛАЎ

— Сярод саіскальнікаў шмат рабочых, людзей, звольненых за парушэнні працоўнай дысцыпліны, і тых, хто доўгі час не працуе, — акрэслівае сітуацыю на сталічнай біржы **галоўны спецыяліст камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ірына КАРНІЦКАЯ.**

Цяжка прыходзіцца тым, хто атрымлівае вышэйшую адукацыю завочна. Напрыклад, быў чалавек увесь час прадпрымальнікам, гандляваў на рынку, а адвучыўся завочна на эканаміста і цяпер прэтэндуе на гэту пасаду. «Тое ж самае з юрыстамі. Ну як чалавек можа займацца правам, калі дагэтуль працаваў толькі на ўпакоўцы ў краме? — кажа Ірына Карніцкая. — З гэтымі саіскальнікамі праблема. Мы прапануем ім перанавучанне — на бухгалтараў, аператараў ПЭВМ».

Большасць шукае працу па спецыяльнасці. Але свае магчымасці грамадзяне ацэньваюць цвяроза. Таму кандыдаты, няхай і з дыпломам ВНУ, якія даўно не працавалі і ўжо страцілі кваліфікацыю, гатовы разглядаць любыя варыянты.

Працсей за ўсё, напэўна, знайсці месца ў гандлі ці грамадскім харчаванні. Там рэгулярна набіраюць прадаўцоў, кантралёраў-касіраў, кухараў, ахоўнікаў, адміністратараў залаў. Буйныя крамы абяцаюць заробкі да 8 мільёнаў, маленькія — да 4. Хутка спатрэбяцца работнікі на сезонныя рынкі.

Пакуль сітуацыя на сталічным рынку працы застаецца адносна напружанай. З пачатку года вакансій стала на 28 працэнтаў менш, а колькасць беспрацоўных вырасла амаль на 19 працэнтаў.

— Прафесійна-кваліфікацыйны дысбаланс узмацніўся. Асабліва ў асобных прафесійных групах. Калі раней наймальнікі не маглі ўкамплектаваць вакансіі некваліфікаванай рабочай сілы, то з 2015 года сітуацыя кардынальна змянілася. Гэтыя месцы цяпер у ліку дэфіцытных і карыстаюцца павышаным попытам, — адзначае **начальнік аддзела аналізу і рэгулявання рынку працы камітэта Святлана ЛЯВОНЧЫК.**

Напрыклад, на пяць вакансій грузчыкаў прэтэндуе 600 беспрацоўных, на пасаду рабочага зелянбуда — 100 чалавек.

Што да працанедастатковых вакансій, то ўжо другі год сярод іх пераважаюць прапановы ў галіне ахвовы здароўя і сацыяльных паслуг. Таксама патрабуюцца начальнікі аддзела (і іншыя кіраўнікі першага ўзроўню), апаратары сувязі, менеджары, электраманцёры на рамонце паветраных ліній электраперадачы (для апошніх адкрыта 100 вакансій). Асаблівасць красавіка — рост попыту з боку наймальнікаў у будаўніцтве. Шукаюць муляраў (для іх у горадзе ёсць 116 прапаноў), цесляроў (гатовы прыняць 90 чалавек), тынкоўшчыкаў, арматуршчыкаў.

Праўда, адзначаюць спецыялісты, нават калі на трох саіскальнікаў налічваецца сотня свабодных месцаў, гэта не значыць, што іх будзе проста заняць. Кваліфікацыя кандыдата можа не супадаць з заяўленымі патрабаваннямі наймальніка. «Калі чалавек усё жыццё працаваў слесарам механазборачных работ і мае трэці разрад, а ў вакансіі пазначана, што патрэбны пяты-шосты, — яго не возьмуць. Нявважна, што вялікі вопыт працы, — каментуе Ірына Карніцкая. — Раней маглі часова запрасіць чалавека, прыгледзецца да яго і прысвоіць разрад, калі работнік здольны выконваць неабходную працу. Цяпер прадпрыемствы гэтага не робяць, адразу бяруць прафесіяналаў».

Саіскальнікам раяць: заўважылі цікавую вакансію — хутчэй тэлефануйце. У наймальніка шматканальная «пастаўка» кандыдатаў, таму прывабнае месца можа значыцца ў базе ўсяго гадзіну.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# ЧАРГА НА ПАСАДУ... ДВОРНІКА

**У правінцыі вельмі шмат ахвотнікаў стаць дворнікам, прыбіральшчыкам памяшканняў, санітаркай або ліфцёрам. Эксперты тлумачаць нечаканы попыт на некваліфікаваную працу некалькімі прычынамі. Тыя, хто мае шэры даход, жадаюць такім чынам легалізавацца. «Усё роўна, дзе працаваць» індывідуальным прадпрымальнікам, якія працягваюць гандляваць несертыфікаванай прадукцыяй. Адбіваецца на сітуацыі на рынку працы і аптымізацыя штатаў на прадпрыемствах, арганізацыях, перспектыва павышэння пенсійнага ўзросту.**

### ЁСЦЬ І ЭКЗАТЫЧНЫЯ ВАКАНСІІ

— У апошні час да нас сталі часцей звяртацца бухгалтары (нават галоўныя. — **Аўт.**) і эканамісты. Іх або скарацілі, або яны засталіся без працы праз закрыццё арганізацыі. Нямала прыходзіць людзей з вышэйшай адукацыяй. Але вакансіі ў асноўным рабочыя: прадавец, слесар па рамонце аўто, электрамеханік па рамонце электраабсталявання. Неабходны цырульнікі, прадаўцы, кантралёры-касіры, кухары, — расказвае **Алена ШАВЕЛЬ, галоўны спецыяліст аддзела прафарыентацыі і прафадукацыі ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Віцебскага гарвыканкама.**

У пачатку года ў абласным цэнтры праз біржу шукалі працу больш за 2,5 тысячы чалавек. 31% з іх — ва ўзросце да 30 гадоў, большасць — 35-гадовыя і старэйшыя.

— Вакансія дворніка нарасхват. Шмат хто хоча стаць санітаркай. Дастаткова дэфіцытная пасада — прыбіральнік памяшканняў, — працягвае спадарыня Шавель.

Новая тэндэнцыя: навучанне работнікаў па заказе наймальнікаў. У прыватнасці, на адным з абутковых прадпрыемстваў пастаянна не хапае рабочых, швачак. Адпаведныя аб'явы трансліруюць у «бягучым радку» па тэлебачанні. Мае вялікую патрэбу ў прадаўцах віцебская гандлёвая арганізацыя. І на біржы працы задавальняюць попыт. Праўда, наваспечаныя гандляры потым пераходзяць у буйныя гандлёвыя сеткі — бо там вышэйшы заробак.



Перыядычна бываюць і вельмі, скажам так, экзатычныя вакансіі.

— Санітар быў неабходны... моргу. Калегі мае ўсё думалі, гадалі, хто захоча там працаваць? Прапанавалі мужчыну, якому каля 45 гадоў. Не пагадзіўся. А хлопец, зусім малады, пайшоў. Не медык, дарэчы, — дзеліцца суразмоўца.

Бываюць жыццёвыя сітуацыі, калі з-за раптоўнай інваліднасці людзі не могуць працаваць на высокай пасадзе. Напрыклад, пасля аварыі мужчыну з дзвюма вышэйшымі адукацыямі прыйшлося перавучвацца на ліфцёра.

### КАРЫСНЫЯ ПАРАДЫ БЕСПРАЦОЎНЫМ

Спецыялісты па працаўладкаванні расказалі пра тыповыя памылкі прэтэндэнтаў на пасады. Недастаткова адправіць працадаўцу рэзюмэ па электроннай пошце. На кандыдата любы наймальнік жадае паглядзець.

Моладзь хоча ўсё і адразу: заробак не менш за 8 мільёнаў, прымальны рэжым працы, зручнае месца размяшчэння... Але тут можа атрымацца, як у анекдоце пра слана ў заапарку: «З'есці ён з'есць, можа, і з'еў бы, але хто яму дасць»?

Калі прадстаўнік наймальніка задае прэтэндэнту на пасаду пытанні, нельга пры адказах выкарыстоўваць часціцу «не». Напрыклад, калі пытанне пра навык, якім кандыдат не валодае, лепш адказаць: «Навучуся!», «Мне будзе цікава навучыцца», «Рознаму за жыццё вучыўся, і гэта змагу!» Той, хто ў канкурэнтнай барацьбе за пасаду адказвае падобным чынам, атрымлівае перавагу.

Не варта спакушацца абяцаннямі рознага роду курсаў хутка зрабіць са сваіх слухачоў прафесіяналаў. Напрыклад, цырульніка — за пару месяцаў. Потым з такім дыпломам уладкавацца будзе амаль немагчыма. З цэнтра занятасці, дарэчы, адпраўляюць на навучанне цырульнаму майстэрству бясплатна, яно доўжыцца 8 месяцаў. Патрабаванне адно — штодня, акрамя выхадных, хадзіць на заняткі. Пропускі без уважлівых прычын могуць скончыцца патрабаваннем кампенсаваць немалыя выдаткі.

Апроч іншага, у цэнтрах занятасці дапамагаюць распачаць сваю справу. Можна скончыць курсы, дзе вучаць прадпрымальніцтву. Пасля абароны бізнес-плана атрымліваюць дзяржаўную субсідыю. Гэтыя грошы вяртаць у бюджэт не трэба. Памер субсідыі залежыць ад сумы бюджэту пражытковага мінімуму і віду дзейнасці (пачынаючы ад 11 бюджэтаў). Гэтага можа быць дастаткова, каб закупіць пэўнае абсталяванне, арандаваць памяшканне і распачаць невялікую вытворчасць.

Спецыялісты дапамогуць і «перакваліфікавацца» ў рамеснікі. Было б толькі жаданне, ды рукі б раслі «з правільнага месца».

Апошнім часам беспрацоўныя часта сталі тэлефанаваць на «прамыя лініі» высокапастаўленым чыноўнікам і дэпутатам, каб тыя ім дапамаглі ўладкавацца на працу. Але наўрад ці губернатар, яго намеснікі, парламентарый зробяць гэта лепш, чым адпаведны спецыяліст у цэнтры занятасці.

Яшчэ адна правераная гадамі практыка — знайсці месца «па знаёмстве». Добра, калі сярод былых аднакласнікаў, прыяцеляў або суседзяў ёсць працадаўцы або тыя, хто можа «замовіць слоўка». Аднак гэта яшчэ не гарантыя, што працоўныя адносіны складуцца ўдала.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**по объекту «12-этажный жилой дом со встроенными помещениями № 31 (по генплану) в микрорайоне Малиновка-6. Встроенные помещения»**

Застройщик – коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад», зарегистрированное Мингорисполкомом 05.01.2015 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192400611.

**Юридический адрес**: 220025, г. Минск, ул. Сергея Есенина, 4-107, тел./факс 234-16-99. Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15. Обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет государственным предприятием «Управление капитального строительства Запад» построены и введены в эксплуатацию объекты:
- жилые дома № 6, 8, 10, 14 по ул. Каролинской;
- жилой дом № 4 по ул. С. Есенина;
- жилой дом № 14а по ул. Короля;
- жилые дома № 12, 16, 22 по ул.Чюрлёниса;
- жилой дом № 6 по ул. С. Есенина.

Цель проекта – строительство административно-торгового помещения для реализации непродовольственных товаров общей площадью 172,17 кв.м на первом этаже 12-этажного 2-секционного 110-квартирного жилого дома со встроенно-пристроенными помещениями универсального назначения № 31 (по генплану) в микрорайоне «Малиновка-6» в г. Минске.

Строительство осуществляется за счет средств физических или юридических лиц.

Начало основного периода строительства объекта – октябрь 2015 года. Окончание строительства – апрель 2016 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу, получено положительное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 27.09.2011 № 732-15/11, от 30.11.2011 № 983-15/11, 12.06.2015 № 358-15/15.

Участок площадью 0,2345 га предоставлен в общее долевое временное пользование государственному предприятию «Управление капитального строительства Запад» решением Мингорисполкома от 28.01.2016 № 178. Свидетельство о государственной регистрации земельного участка от 16.10.2013 № 500/1032-8354.

Получено разрешение Госстройнадзора от 18.03.2016 № 2-203Ж-004/12.

Генеральный подрядчик – ООО «МИРАЛИТ».

Жилой дом запроектирован 12-этажным 2-секционным, всего квартир – 117.

Конструкция здания – монолитный каркас со стенами из ячеистобетонных блоков.

**Для привлечения дольщиков к строительству по договору создания объекта долевого строительства для юридических и физических лиц предлагается:**

- встроенное помещение административно-торгового назначения для реализации непродовольственных товаров без учета выполнения внутренних отделочных работ общей площадью 172,17 кв.м на 1-м этаже жилого дома стоимостью за 1 (один) кв.м общей площади в размере, эквивалентном **990 долларов США,** по курсу, установленному Национальным Банком Республики Беларусь на день оплаты.

**Условия оплаты** – единовременная оплата в течение **30 (тридцати) календарных дней** со дня регистрации договора в Мингорисполкоме.

Стоимость 1 кв.м общей площади фиксируется в долларовом США эквиваленте и остается неизменной в долларовом США эквиваленте до окончания срока действия договора.

Оплата производится в белорусских рублях по курсу НБ РБ на день оплаты.

**Для заключения договоров необходимы:**

- паспорт (свидетельство о регистрации для индивидуальных предпринимателей) и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор.

Документы для заключения договоров будут приниматься с 14.04.2016. До заключения договора создания объекта долевого строительства обязательно осуществляется предварительный осмотр объекта долевого строительства.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованной ранее.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: г. Минск, ул. С. Есенина, 4-107, тел.: (017)234-16-99, (044)795-44-44.

# ПЕРШЫЯ СПІСЫ ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ

## Правал Мінскага падполля ў верасні 1942 года вялікім ценем лёг на ўсіх яго ўдзельнікаў...

**У Беларусі словы «партызан» і «падпольшчык» маюць асобную гісторыю, вялікую ролю ў якой пры аднаўленні праўды адыгрывалі спісы. Першыя спісы партыйцаў-падпольшчыкаў Беларусі былі надрукаваны ў сродках масавай інфармацыі ў 1928 г. напярэдадні 10-й гадавіны ўтварэння БССР і КПБ. У іх склад уваходзілі 118 чалавек, з якіх 107 з'яўляліся прадстаўнікамі рабочага класа. Партыйцы-падпольшчыкі нават дзяліліся на групы паводле стажу падпольнай дзейнасці: да 1905 г. — 32 чал., з 1905-га па 1913 г. — 48, з 1914-га па 1916 г. — 27 чал. (ва ўсёй УКП(б) значылася 10 758 партыйцаў-падпольшчыкаў). Больш за 65 працэнтаў беларускіх удзельнікаў падпольнага руху займалі адказныя пасады ў партыйных, дзяржаўных і прафсаюзных органах Савецкай Беларусі.**

Навуковая канферэнцыя да 50-годдзя ўтварэння Кампартыі Заходняй Беларусі (1973 г.). Сярод удзельнікаў — і былыя падпольшчыкі.




Злева направа сядзяць: Д.І. Розеншайн, М.Ф. Капіч, Т.А. Бурава, Р.С. Каган, П.С. Крынчык, С.М. Малько, А.Т. Кузьмін (сакратар ЦК КПБ), Р.Р. Шырма, Ф.Б. Пірышка, Л.Г. Шайкоўскі, З.Г. Крылаткіна; стаяць у першым радзе: Я.Р. Міско, М.А. Крыўшын, П.Ф. Дзмітрук, С.Х. Левіна, Н.М. Шмуклер, М.Е. Крыштафовіч, Х.Я. Хомскі, М.С. Арэхва, В.Ф. Станкевіч, А.П. Сцепановіч, К.Н. Такушэвіч, Д.Д. Сівый, Г.М. Муха-Мухноўскі, І.П. Каросас, П.П. Ліпіла, А.М. Мацко; у другім радзе: Р.І. Малюкявічус (злева і вышэй), Т.І. Прытыцкая, С.З. Пачанін (злева ззаду), І.В. Малец, Ф.А. Цыгельніцкая, М.Я. Міхалоўскі, А.В. Шутовіч, А.І. Федасюк, М.В. Бурсевіч (ззаду), П.І. Варабей, Е.К. Лябецкая, І.С. Сідарук (ззаду), А.І. Шкляр, Ф.Д. Кавалеўскі, У.П. Ласковіч (вышэй), А.І. Багданчук, А.С. Андрушэвіч (ззаду), А.С. Пястрак, Ф.М. Шутовіч (вышэй справа), А.К. Шчасная, І.Ф. Семенікаў (вышэй), І.І. Райскі, С.Р. Анісаў, Л.Я. Пучык; у верхнім радзе: Р.І. Налівайка, І.О. Царук, І.П. Хаўратовіч (вышэй), М.А. Давідовіч, У.М. Куратнік, А.А. Сакалоўскі, С.Ф. Пецяруха, Н.М. Тарас, У.П. Гуль, М.М. Шэўц, А.Б. Гендлер, І.С. Какала, М.Ш. Жукоўскі-Зільбер (ніжэй).

Але лёсы «нелегалаў» носяць і трагічны характар. У 1928 г. вядомы грамадскі дзеяч Беларускай ССР Васіль Шаранговіч «за кіраўнічую партызанскую працу ў падполлі ў час акупацыі Беларусі белапалякамі» атрымлівае ганаровую ўзнагароду — ордэн Чырвонага Сцяга. А ў 1937 г. яго нечакана арыштоўваюць і расстрэльваюць як... агента польскай дэфензівы. Рэабілітуюць у 60-я гады... У канцы 30-х гадоў мінулага стагоддзя кляймо здрадніка лягло на цэлую падпольную арганізацыю — Камуністычную партыю Заходняй Беларусі, якая дзейнічала ў межах тагачаснай Польшчы. Праўда, аб гэтых людзях стала вядома толькі праз 20 гадоў (у 1957 г.).

Вось што сказаў аднойчы аб удзельніках заходнебеларускага рэвалюцыйнага руху былы член ЦК Кампартыі Заходняй Беларусі, выдатны гісторык Мікалай Сямёнавіч Арэхва: *«Гэта былі не тэрарысты, як пішуць на Захадзе, а рэвалюцыянеры, якія прайшлі цярністы шлях самаадданай барацьбы за самавызначэнне беларускага народа ў складзе адзінай савецкай дзяржавы»*.

БЫЎ цёплы летні дзень 1980 года. На маім тагачасным рабочым стале зазвінеў тэлефон. Прыемны мужчынскі голас запрасіў мяне прыйсці ў будынак, у якім сёння размяшчаецца рэзідэнцыя Прэзідэнта, а тады — апарат ЦК КПБ. Адбылася гутарка, у якой мне прапанавалі прыняць удзел у разглядзе некаторых пытанняў гісторыі Мінскага падполля перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Я сказаў, што да гэтага не займаўся сур'ёзна гісторыяй вайны. У адказ пачуў: «Гэта не бяда, важна, што вы ведаеце архіў». Так змянілася месца маёй працы, а тэма Мінскага падполля заняла адно з цэнтральных месцаў у маім жыцці.

...Нямецкія кіраўнікі ў Берліне і ў Мінску думалі, што ў тыле сваіх войскаў у СССР да іх будуць варожа ставіцца дзве сілы — члены камуністычнай партыі і яўрэі, а таму падзялілі Мінск на дзве часткі: белы і «рускі раён». Але германцы нават у кашмарным сне не змаглі прадбачыць, што зрыў іх планаў у Беларусі адбудзецца пры актыўным удзеле мінскіх падпольшчыкаў, у рады якіх уваходзілі карэнныя мінчане, былыя савецкія ваеннаслужачыя, бежанцы з заходніх раёнаў Беларусі, вязні гета, ваеннапалонныя. Кіруючая роля ў антыакупацыйным руху належала прадстаўнікам камуністычнай партыі.

Што рухала гэтымі людзьмі? Можна казаць, што супраціўленне зараджалася на аснове аб'яднання дзвюх духоўных сіл: пачуцця патрыятызму, якое ўзнікла ў дзяцінстве і развівалася з дапамогай спецыяльных органаў дзяржавы, і асабістай рэакцыі на ўварванне ворага, яго арміі.

Абапіраючыся на звесткі архіва, можна назваць і этапы развіцця супраціўлення: маскіроўка варожых адносін да захопнікаў, стварэнне падпольных арганізацый з ліку праверанных асоб, выпрацоўка тактыкі і стратэгіі падпольнай дзейнасці, наладжванне сувязі з фронтам, вядзенне падпольнай барацьбы да доўгачаканага прыходу Чырвонай Арміі.

На працягу першага перыяду (1941-1943) агульнагарадскі каардынуючы орган падпольшчыкаў (Мінскі гаркам КП(б)Б, сакратар І.К. Кавалёў) знаходзіўся ў Мінску, падчас другога перыяду (1943-1944) гэты цэнтр размяшчаўся ў партызанскай зоне (сакратар С.К. Ляшчэня і інш.). У першым выпадку друкаваным органам мсціўцаў з'яўлялася газета «Звязда», у другім — «Минский большевик».




Пасведчанне, выдадзенае Марыі Калінінай як удзельніцы французскага супраціўлення.

Члены падпольных арганізацый пры падрыхтоўцы і правядзенні дыверсій улічвалі іх вынікі для мірных гараджан (гэта тычылася разбурэння і пашкоджання электрастанцый, хлебазаводаў, медыцынскіх устаноў, іншых падобных прадпрыемстваў). Такое стаўленне існавала і «наверсе». У трагічны 1941 г. у Беларусь паступіў загад І. Сталіна: пакідаць немцам «голую зямлю» (мелася на ўвазе знішчэнне запасаў збожжа, жывёлы, харчу, разбурэнне электрастанцый). Яго апратэставаў П.К. Панамарэнка (маўляў, гэта можа прывесці да голаду мірнага насельніцтва). Вясною 1945 г., у апошнія дні Рэйха, Гітлер прадыктаваў загад аб затапленні Берліна (месцаў, дзе хаваліся ад бамбардзіровак мірныя грамадзяне), аб знішчэнні запасаў ежы. Ваенныя (міністр узбраення Шпеяр і інш.) адмовіліся выконваць каманду.

АДСТУПЛЕННЕ Чырвонай Арміі ў 1941–1942 гг. падзяліла СССР на часткі: на савецкі і нямецкі тылы. Першая частка называлася «Вялікай зямлёй», а другая (у германскіх дакументах) — «Усходняй акупаванай тэрыторыяй». На захопленай зямлі паўстала пытанне: з кім ты, цывільны чалавек: з нямецкім акупацыйным рэжымам ці з партызанамі і падпольшчыкамі? Знаходжанне людзей на акупаванай тэрыторыі кантралявалася савецкімі праваахоўнымі органамі аж да пачатку «часоў» Л.І. Брэжнева.

Сярод дакументаў, народжаных 20-годдзем Вялікай Перамогі (9.05.1965 г.), вылучаюцца спісы ўдзельнікаў партызанскага і падпольнага руху Беларусі, прадстаўленыя ў тыя дні ўрадам БССР і членамі Прэзідыума ЦК КПБ да прысваення ганаровага звання Героя Савецкага Саюза. Чаму яны «не прайшлі» ў Маскве — невядома да сёння, бо папярэдняя дамоўленасць існавала. Улічваючы гэта, прапануем увазе чытача назвы спіс: Андрэеў Анатоль Яўгенавіч, Булак Павел Іванавіч, Бірулін Міхаіл Фёдаравіч, Бачыла Фёдар Апанасавіч, Кірылаў Рыгор Лазаравіч, Кажушка Павел Іванавіч, Джагараў Міхаіл Міхайлавіч, Асененка Васіль Мікалаевіч, Руцін Сяргей Пятровіч, Семянчук Мікалай Антонавіч, Цыбут Дзмітрый Васільевіч, Шуцкі Уладзімір Пятровіч.

На Мінскае падполле вялікім ценем лёг яго правал у верасні 1942 г. За кратамі нямецкай турмы аказаліся болей за 80 удзельнікаў супраціўлення, сярод якіх яго арганізатары і кіраўнікі: І.К. Кавалёў, Д.А. Караткевіч, В.К. Нікіфараў, К.І. Хмялеўскі. Поўны адказ на пытанне аб прычынах трагедыі адсутнічае. У 1960-я гады гэта дайшло да замежных гісторыкаў (Германія), якія сталі пісаць пра здраднікаў, што былі ў радах падпольшчыкаў. Але тон такіх твораў паступова мяняецца пад уплывам прызнання вялікай ролі падполля ў забойстве Вільгельма Кубэ.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусь на адказныя пасады былі накіраваны П.К. Панамарэнка (на роль першага сакратара ЦК КП(б)Б) і Л.Ф. Цанава — наркамам НКУС БССР. Першы быў добрым сябрам Г.М. Маленкова, другі — стаўленік вядомага сваёй жорсткасцю Л.П. Берыі. Нядрэнна ведаў абодвух і Сталін. У час вайны Панамарэнка і Цанава, на жаль, унеслі свой «уклад» у нараджэнне ў канцы 1942-га — пачатку 1943 года так званага «абвінавачвага ўхілу» да Мінскага падполля з боку Вялікай зямлі.

У першыя мірныя дні НКУС СССР і БССР, былы Цэнтральны штаб партызанскага руху аб'явілі Мінскі падпольны гаркам КП(б)Б арганізацыяй, створанай здраднікамі «для вылоўлівання і арышту савецкіх людзей». Беларускі пісьменнік Кандрат Крапіва напісаў нават драму «Людзі і д'яблы», у якой дзясяткі мінчан без грунтоўных падстаў маляваліся здраднікамі. Негатыўная рэакцыя ветэранаў вайны была масавай. Вядомы сатырык мусіў зняць свой твор з пастаноўкі. Вось умовы, у якіх пачалася работа па стварэнні спісаў мінскіх падпольшчыкаў.

ЧАМУ мы сёння шануем і зберагаем спісы ўдзельнікаў падпольнага руху? Па прычыне іх нараджэння ў цяжкіх умовах першага пасляваеннага перыяду. У 1945 і 1947 гг. ЦК КП(б)Б прыняў нават спецыяльныя пастановы па ўпарадкаванні і зберажэнні такіх дакументаў. Перад намі старонкі маладвядомай дзейнасці гісторыкаў, архівістаў, ветэранаў вайны па стварэнні найбагацейшага ў Еўропе архіва дакументаў партызанскага і падпольнага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Сёння ён змяшчае больш за 400 тысяч прозвішчаў.

Ва ўводзінах да трохтомніка «Усенародная барацьба ў Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны» робіцца спроба праліць дадатковае навуковае святло на паняцці «падполле» і «падпольшчык». Але ў добрым намеры не знайшлося месца паказу трагізму, які існаваў у лёсах многіх падпольшчыкаў з 1941-га па 1943 г. з прычыны слабай дапамогі ім з боку Вялікай зямлі.

У 1995 г. адбылося першае выданне поўнага спіса мінскіх падпольшчыкаў. Зроблена гэта на старонках кнігі «Мінскае антыфашысцкае падполле» (6274 чал., звесткі на 15.11.1984 г.). Шлях да выдання твора быў няпростым. Пасля рэдактарскай праўкі ў Беларускім дзяржаўным выдавецтве рукапіс перадалі на Паліграфкамбінат імя Я. Коласа. Там папрасілі папярэднюю аплату. А яе не было. Мы, аўтары, — супрацоўнікі тагачаснага Нацыянальнага архіва, звярнуліся з гэтым пытаннем у Адміністрацыю Прэзідэнта, якая тады размяшчалася ў левым крыле Дома ўрада. Нас уважліва выслухалі, паабяцалі дапамагчы. Праз два дні мне патэлефанаваў дырэктар Дома друку М. Герман і сказаў: «Рукапіс у рабоце». Спісы мінскіх падпольшчыкаў у друкаваным выглядзе ўпершыню ўбачылі свет 30 красавіка 1995 г., напярэдадні 50-годдзя Вялікай Перамогі.

А як скланіся лёсы мінскіх падпольшчыкаў? Марыя Мікалаеўна Калініна — адважная падпольшчыца, у гады вайны дапамагала выконваць заданні нелегальнага агента будучаму першаму пасляваеннаму прэзідэнту Польшчы Баляславу Войцэхавічу Беруту. У кватэры, размешчанай у цэнтры горада, яна здолела зберагчы ад арышту і гібелі гэтага чалавека і дзясяткі яўрэйскіх дзяцей. 9 Мая 1945 г. Марыя Мікалаеўна сустрэла ў Францыі — як удзельніца французскага Супраціўлення... Памерла ў Мінску на 94-м годзе жыцця, адмовіўшыся ад лекаў пасля таго, як заўважыла страту цікавасці да сябе як да чалавека.

Амаль забытай пайшла з жыцця падпольшчыца №1 Алена Мазанік. Аднойчы я патэлефанаваў ёй з просьбай сустрэцца ў Нацыянальным архіве са студэнтамі з Германіі. У адказ пачуў: «Я не жадаю сустракацца з немцамі — ні з маладымі, ні са старымі». Яна пайшла з жыцця ў 72 гады, адзінокай, без сям'і і дзяцей. Знішчаны і ўсе матэрыяльныя помнікі аб гістарычнай аперацыі 22.09.1943 г.: дом, дзе жыў і загінуў Вільгельм Кубэ, сялянская хата Вярбіцкіх у Янушкавічах, дзе планавалася аперацыя і адкуль адпраўляліся ў Маскву па званні Герояў Савецкага Саюза Алена Мазанік і Марыя Осіпава.

Былая мінская падпольшчыца Алена Іосіфаўна Вярыга апошнія гады жыцця правяла ў Італіі, у дачкі. У адным з лістоў у Мінск яна пісала: «... Нічога не радуе: ні сонца, ні мора. Бо я не дома, не ў Беларусі».

ЯК сёння трэба вывучаць гісторыю Мінскага падполля (1941-1944)? Робячы гэту нялёгкую працу, неабходна памятаць пра спадзяванні ўдзельнікаў гістарычных падзей на нашу аб'ектыўнасць і прынцыповасць. Ажыццявіць тыя надзеі — наш галоўны абавязак.

**Яўген БАРАНОЎСКІ.**

**Извещение об открытом аукционе по продаже права аренды земельного участка для строительства объекта в городе Гродно 12 мая 2016 года**

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.) | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | ул. Суворова (въезд Рамесны) | 1,0138 | 440100000001008998 | 840 898 473 | 84 000 000 | 30 206 025 | Строительство объекта производственного назначения (производство продуктов питания) |

Победитель аукциона обязан:

- в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 1 года;

- приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации;

- осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

- возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 № 49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

**Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».**

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 152101752, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона.

4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

**Аукцион состоится 12 мая 2016 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 57, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 11 апреля по 4 мая 2016 года**. Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 72-05-46**.

**Адрес сайта: www.grodno.gov.by**

■ Размовы на кухні

# ХТО Ў НЕБА ГЛЯДЗІЦЬ — БЕЗ ХЛЕБА СЯДЗІЦЬ

**Бадай кожную вясну жонка спадара Куркача пачынае разважаць аб тым, як было б добра мець сваю дачку пад Мінскам. Сядзела б яна там з дзецьмі ўсё лета, з ягадкамі ды морквачкай завіхалася. І былі б на зіму і варэнні, і саленні. Але ж дачы каля сталіцы дарагія, а залатога запасу ў сям'і няма. Ды і рашучасць жонкі звычайна на словах і канчаецца, так што за рыдлёўку брацца сям'я не спяшаецца...**
**У адрозненне ад сваёй калегі Ірыны СІДАРОК, у якой ужо цяпер на падаконніку расада буяе. У яе дачы таксама няма, але ж затое хатка на вёсцы маецца, праўда, за 120 кіламетраў ад сталіцы. І вырашыў Сяргей КУРКАЧ запрасіць Ірыну на звяздоўскую «кухню», каб разам падумаць, у што абыдуцца гэтыя памідоркі ды гуркі.**


Фота Надзеі БУЖАН.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Некалькі «падаконных» парад ад Куркача:**

**Шматгадовыя расліны (пятрушка, мята, меліса, сельдэрэй) і памідоры добра паліваць вадзічкай, у якой мяса перамывалася. Праўда, каб пасля над такой зямелькай мошкі не лёталі, яе потым трэба слабым растворам марганцоўкі (светла-ружовага колеру) прадэзынфіцыраваць.**
**У гэтым жа растворы, дарэчы, трэба некалькі гадзін цыбуліны вымочваць, якія высаджваць у гаршчок на зяленіва збіраешся, каб пер'е ніякая зараза не брала.**
**Калі памідорная расада праз недахоп святла пачынае выцягвацца, а сцябло робіцца танюткім ды кволым, варта паліць расліннасць растворам вады з малаком (паўшклянкі малака на літр вады).**

## Блізка відаць, ды далёка дыбаць

**Сяргей Куркач** — Зямелька твая не блізкая! Гадзіны дзве, мабыць, трэба на дарогу. І колькі разоў на месяц ты туды наведваешся? У электрычцы трэсціся не надакучыла?
**Ірына Сідарок** — Пэўна, на грамадскім транспарце я б туды часта не ездзіла, а электрычкі да нас увогуле не ходзяць — толькі аўтобусы, а пасля яшчэ тры кіламетры пехам. Толькі мяне гэтыя акалічнасці не хвалююць — я на ўласным аўто рулю кожныя выхадныя ў «гарачы» сезон.
**С.К.** — Ага! Цяпер ты мне яшчэ прапануеш і машыну купляць, каб жонку на прыроду вывозіць. Машына, можа, і патрэбна, але ж у якую капейку кожная паездка выліваецца, ты сама падлічвала?
**І.С.** — А як жа! Машынка ў мяне малалітражка — 6 літраў паліва «з'ядае» на сотню кіламетраў. Перад паездкай я ў яе бензіну на 200 тысяч заліваю — хапае туды-назад і яшчэ па горадзе на некалькі дзён застаецца. А на аўтобусныя білеты толькі на аднаго чалавека цяпер амаль 150 тысяч у два бакі патрэбна. Вось і лічыце. Калі сям'ёй нават утраіх ехаць — гэта амаль паўмільёна. А на машыне яшчэ і з сабой прывязеш таго-сяго. У руках не цягнеш ды ад графіка аўтобуснага не залежыш — адны «плюсы».
**С.К.** — Я таксама б не адмовіўся ад машыны, калі б мяне жонка вазіла. Але з гэтай тэхнікай у нас нехта не сябруе. Дарэчы, ты толькі пра бензін мне кажаш, а рамонт, амартызацыя...

## Глухому і варона салавей

**І.С.** — Вядома, раз на год тэхагляд праходжу і кожны квартал нешта ў ёй мяняю. Гэта адзінае, чым машына крыху «кусаецца», але ж дзірку ў кішэні не прагрызае. І ўвогуле, вы мяне пра расаду размаўляць запрасілі ці лекцыю аб утрыманні аўто чытаць?
**С.К.** — Расада таксама ў паветры не расце. Яе ж некуды пасадзіць трэба. А для гэтага тару купіць, зямлі накапаць, насенне здабыць... Я хоць і без град, але на падаконніку зяленіва амаль увесь год вырошчваю, а куст памідорны ў мяне летам на балконе жыве. А для расады, мне здаецца, у кватэры цэлы пакой патрэбен. Ды і каштаваць гэта будзе, пэўна, не дробязь, як мой кропчык.
**І.С.** — Зараз я вам на палічках усё раскладу. Пакецік насення ў сярэднім каштуе 5,5 тысячы. Каб набыць усё, што пойдзе на грады, іх патрэбна прыкладна 30 (па 3-4 пакецікі агуркоў ды памідораў, морквы, астатняе па адным). Прарошчваю я звычайна памідоры, перац, капусту ў пластыкавых упакоўках ад торцікаў. Пасля пікірую кожную расліну ў асобны посуд. 40 тарфяных кубачкаў каштуюць амаль 200 тысяч, а пластыкавы паддон з 12 касетамі — 45 900. Мне трэба звычайна каля 150 ёмістасцяў. Дадайце сюды грунт па 20 тысяч за мех (спатрэбіцца мінімум два). У выніку на ўсю расаду — каля мільёна. Аднак каля паўмільёна я эканомлю на пасудзінах. Штосьці застаецца з мінулага, штосьці за год збіраецца з-пад смятаны ды ёгуртаў. А калі не хапае, то і кардонныя ўтулкі ад туалетнай паперы ў справу ідуць.
**С.К.** — Табе, мабыць, таксама ў эканамічны аддзел трэба, бо туалетнай паперай вы ўвогуле без адходаў карыстаецеся. Яно вядома, што пластык ад ёгуртаў па сямейным бюджэце біць не будзе, а ці ўся расада ў цыбе да град даязджае?
**І.С.** — Вядома, не. Таму і сеем больш. Калі надта не пашанцуе (частка засохне ці па дарозе зломіцца), прыходзіцца пасля і гатовую купляць. Летась калівa памідора 3000 рублёў каштавала «па-суседску», перцы — крыху даражэй. Пару дзясяткаў можна і набыць, а на ўвесь агарод закупляць на рынку паўстае ў капейчыну. Як у нас, то раслін 300 прыкладна на градах расце.

## Хто полю годзіць — у таго жыта родзіць

**С.К.** — Так. Усе абавязковыя грашовыя выдаткі ты мне па палічках, мабыць, расклала. Але, пэўна ж, ніхто з агароднікаў свае працазатраты дакладна не падлічваў. Нават на сваю падаконную гаспадарку я штодня каля паўгадзіны трачу. Ваду абавязкова на крэмніі настойваю. Спецыяльнай лейкай з доўгім носікам акуратна паліваю, каб на кветкі не трапіць. Як памідоры зацвітуць, я пёркам па некалькі разоў з кветкі-таты на кветку-маму пылок пераношу, пакуль не пабачу, што плод завязаўся. А табе на ўласных 20 сотках, як валу, араць трэба. Ні серыял паглядзець, ні з хлопцам/сяброўкай кубачак кавы выпіць. Адзін агарод у галаве.
**І.С.** — У чым працы затраты вымяраць прапануеце? Працаднях, працагадзінах, кропельках поту? Фізічная праца — не толькі найлепшы адпачынак для мазгоў, а і суцэльная фізкультура. Гляньце вось на мяне: і жывот з кубікамі, і біцэпсы на руках маюцца. Карацей, карысна гэта для фігуры. І на фітнесе сэканоміць можна, і на салярыі, калі ў купальніку працаваць. Вы вось у зал спартыўны які ходзіце, у перарывах паміж апыленнямі? У нас, дарэчы, гэтым пчолы займаюцца.
Цяжкавата рыдлёўкай махаць ды з зеллем змагацца толькі напачатку, пасля зімы. Потым уцягваешся, а стома робіцца прыемнай — спіш лепей. А кава, калі ласка, увечары, і не толькі кава, а і шашлычок. Хаця, безумоўна, галоўнае ў агародніцтве — жаданне. А эканомія і натуральнасць прадукту — справа другая.
**С.К.** — З фітнесам зімою ў мяне пэўныя праблемы ёсць. То часу няма, то грошай шкада. Таму я свае кубікі на пузе толькі ўлетку і намацваю, калі ў бацькоў на «фазэндзе» сельскай гаспадаркай займаюся сур'ёзна. Але гэта лірыка. Давай зноў па тэме.
Здаецца мне, каб нешта мець з агарода, трэба пра яго ўвесь час клапаціцца і жыць на вёсцы. А што за выхадныя паспееш? Напрыклад, мая знаёмая на сваю дачу два разы на месяц ездзіла ўлетку. Шмат чаго вырошчваць спрабавала, але атрымлівалася не вельмі. То памідоры з гуркамі пасохнуць, то маліна абсыпецца, а як шкада было, калі цудоўныя клубніцы пагнілі!..
**І.С.** — Ага, і шпакі за гэты час вішню абяруць. Але калі захацець, то можна і шмат захаваць. Калі ведаеш, што доўга не прыедзеш, памідоры трэба абкапаць і пазаліваць па вядры вады пад іх. Галінкі з вішнямі паабвязваць марляй — яны і выспеюць, і птушкі да большасці з іх не дабяруцца. А маліна доўга родзіць — на варэнне паспееш назбіраць. З клубніцамі цяжэй. Тады, каб не плаціць потым за вядро ягад шалёныя грошы, трэба «ляцець» збіраць сваю пасля працы сярод тыдня.

## Запас бяды не чыніць?

**С.К.** — Працуеш-працуеш... А калі ўраджай сапраўды ўдаўся, яго ж яшчэ і захаваць трэба. А дзе? Варэнне ў кватэры пад тэмпературы можа «ўзляцець», бульба — прарасці ці згніцці. Вось мой сусед купіў неяк сартавой бульбы тры мяхі, і трэціна з яе пэўна ж згніла. А мы з жонкай па некалькі кіло за раз набывалі — і нармальна. А для гуркова-памідоравых кансерваў гароднiну на аптовым рынку ў Ждановічах куплялі. У сезон яна капейкі каштуе.
З бульбай увогуле сёлета нейкія цуды адбываюцца. Па вясне яна яшчэ таннейшая, чым увосень стала. Зараз у асобных крамах на акцыі яе па 3000 за кіло набыць можна. Сусед мой увосень браў па 4000, і гэта здавалася нядорага.
**І.С.** — Праўда ваша. У гарадскіх кватэрах склеп не пабудуеш. Хоць некаторыя на першым паверсе выкопваюць. А вось астатнім... Тым не менш каб не ездзіць штотыдзень на вёску яшчэ і ўзімку, запас дома, лічу, захоўваць трэба. А вось як паліцы пусцець пачынаюць, тады праменад у вясковы склеп патрабуецца.
Пакуль цёпла — бульба на балконе, потым мы ў шафу ў калідоры мех перацягваем. Але ж з'ядаецца яна хутка — у нас дакладна не згніе. Закаткі, здараецца, ад тэмпературы і ўзрываюцца, але мне больш падабаецца, калі іх шмат і на любы густ пад рукамі. І не трэба думаць, як расцягнуць слоік агуркоў на «гарошак», расольнік ці яшчэ што. Колькі вы там накупляеце на рынку? А пасля чагосьці не хопіць — і зноў у краму памчаў? А ў нас для нарыхтовак усё на агародзе, побач. Рабі, колькі нарасло.
**С.К.** — Так-так. Уся такая правільная, разумная... А бульбу на балконе трымаеш. Пад сонейкам, каб яна пазеленела. А шафа ў калідоры ў цябе з пастаянай тэмпературай? Можа, кандыцыянер там у цябе маецца паміж паліцамі?
**І.С.** — У мяне ў калідоры так паветра свішча праз занадта працаздольную выцяжку, што ніякія павышаныя тэмпературы не страшныя. Так што на паліцах у мяне толькі слоікі. А што бульба зелянее, то неяк не заўважала я такога. Можа, хіба ёй на сонейку трэба ўсё лета праляжаць, каб сапсавацца. Адзіны момант — пах земляны, калі яна ў шафе зімой стаіць, крыху адчуваецца. Але ж у калідоры мы не жывём, а ў астатнім дамашні клімат яна не псуе.

## Там вароты пірагом падпёрты

**І.С.** — Гляджу я, прасунуты вы агароднік, хоць і падаконны. Вам бы на прастор выйсці, на зямлю, развярнуцца са сваёй зяленінай. Тым больш што ва ўласнасць і зямельку можна набыць, а не толькі хатку. Глядзіш, на старасці і спатрэбіцца. Паветра свежае, па траўцы басанож...
**С.К.** — Так добра разважаць, калі ў цябе ў банку мяхі з грашыма захоўваюцца. Я тут пяць гадоў таму паспрабаваў пашукаць дачку каля Мінска. На адлегласці 50 кіламетраў ад сталіцы самая танная прапанова была — 15 000 долараў. На малюнку, здаецца, і прыгожая, а насамрэч — ці то пуня, ці то хлеў.
**І.С.** — Вось куды вы замахнуліся, пад сталіцай! Можа, яшчэ і непадалёк ад чыгункі, ды каб вокны ад лязгату цягнікоў не трэсліся, і каб ісці было хвіліны тры? Вы не толькі пра адлегласць думайце, а яшчэ і пра зручнасць. Ну каму тая ваша дача патрэбна? Вада ў садовым таварыстве толькі ў сезон, вакол узімку толькі вецер і рабаўнікі. На вёску трэба глядзець, шаноўны, на вёску. Тут вам і хата паўнавартасная на ўвесь год, і вада калодзежная, і зямлі не на тры радочкі град. Ды і кошт памяркоўны. Асабліва цяпер, калі цэны нават на сталічную нерухомасць падаюць. Вунь у нас на вёсцы цяпер толькі 4000 «зялёных» просяць за хату. З яблыневым садам, з 15 соткамі, з цудоўным кветнікам пад вокнамі. А ёсць і больш бюджэтныя варыянты — да 3000 долараў.
**С.К.** — Во як рынак паваліўся. І расказваеш так «смачна». Можа, і сапраўды да цябе ў суседзі запісацца... Цяпер засталося толькі з транспартам разабрацца. У мяне ж уласнага аўто няма. А да цябе на аўтобусе больш за дзве гадзіны перціся, а потым яшчэ, кажаш, тры кіламетры пешшу?! Выйсце адно — на «хвост» табе сесці.
**І.С.** — За руль вам трэба сесці! Жонка, трое дзяцей, а вы дагэтуль без машыны. Гэта ж зручна не толькі куды далёка выбрацца, а і ў тую ж краму на закупку вялікую, па садках-гуртках дзяцей развесці. Недапрацоўваеце вы тут, дружа. Працэнкі варыянт малалітражкі не самага свежага году выпуску сёння пару тысяч долараў каштуе. А калі пашукаць... Ну, будзеце ўкладваць у яе, вядома, але ж затое сам сабе гаспадар, ва ўсіх сэнсах.
**С.К.** — Згодзен! Пабягу грошы зарабляць. А ты стол рыхтуй — наваселле сьвяткаваць разам будзем, па-суседску.

**Сяргей КУРКАЧ**, *kurkach@zviazda.by*.
**Ірына СІДАРОК**, *sidarok@zviazda.by*

■ Тым часам

# СМАК БЯРОЗАВІКУ СПАДАБАЕЦЦА КІТАЙЦАМ

**Мазыр стаў пабрацімам кітайскага Сюйчжоу, а Жлобін аформіў дружбу з горадам Ляньюньган. Дагавор пра ўмацаванне сувязяў падпісаны ў ходзе паездкі афіцыйнай дэлегацыі Гомельшчыны на самы ўсход Кітая — у правінцыю Цзянсу, якая знаходзіцца на ўзбярэжжы Жоўтага мора.**

Старшыня камітэта эканомікі Гомельскага аблвыканкама Эльвіра **КАРНІЦКАЯ** падкрэслівае: кожны дагавор — новы крок да збліжэння з Кітайскай Народнай Рэспублікай:
— Найважнейшая з падпісаных папер — дагавор аб пагадненні па супрацоўніцтве ў межах праекта «Эканамічны пояс Шаўковага шляху». Маштабная лагістычная схема створыць сур'ёзныя перадумовы для эканамічнага развіцця краін і рэгіёнаў, якія ўключаны ў яе. Гаворка не толькі пра транспартную інфраструктуру, але таксама пра актывізацыю гандлю і будаўніцтва прадпрыемстваў на грандыёзным маршруце. Самым прыбытковым напрамкам Шаўковага шляху спецыялісты лічаць напрамак Кітай — Расія — Еўропа. Беларусь размяшчаецца менавіта на гэтым участку, што абяцае нашай краіне пэўныя перспектывы.
Таксама падпісаны дагавор пра пастаўкі на поўдзень Кітая харчовых і нехарчовых тавараў. Размова ідзе ў першую чаргу пра ялавічыну і малочныя прадукты. Першыя пастаўкі ялавічыны на кітайскі рынак чакаюцца ўжо сёлета, а цяпер завяршаецца атрыманне сертыфікатаў. Адначасова зацікавілі цікавасць кітайцаў да кансерваў з агародніны, мёду і сокаў. Асабліва іх зацікавілі маркоўны і бярозавік — сапраўдная экзотыка для Усходняй Азіі.
Сярод нехарчовых тавараў асаблівы інтарэс выклікала прадукцыя вытворчасці «Светлагорскхімвалакно» — бакі дамовіліся пра пастаўку вугляводародных нітак ужо ў канцы года. Важным вынікам візіту стаў і дагавор паміж ААТ «Гомсельмаш» і кіраўніцтвам горада Сюйчжоу аб стварэнні на кітайскай тэрыторыі яшчэ аднаго сумеснага прадпрыемства па вытворчасці кормаўборачнай тэхнікі.
Агульныя адукацыйныя праекты будуць толькі пашырацца. Гомельскі ўніверсітэт імя Ф. Скарыны склаў у Цзянсу дагавор з трыма ўстановамі: Нанкінскім універсітэтам і дзвюма ВНУ ў Сюйчжоу. Падпісаны дагавор з Нанкінскім універсітэтам навукі і тэхналогій па арганізацыі Гомельскага рэгіянальнага Інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя.
Прапрацоўваюцца розныя аспекты вывучэння кітайскай мовы і культурных традыцый гэтай краіны. Ужо сёння вядома, што выкладчыкамі новай ВНУ стануць высокапрафесійныя спецыялісты з КНР, а першым студэнтамі — выпускнікі школ Гомеля і Жлобіна, дзе вывучаюць кітайскую мову.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 26 апреля 2016 г. ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ КОНФИСКОВАННОГО ИМУЩЕСТВА

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества)** | Квартира №28, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, общей площадью 106,9 м², жилой площадью 67,6 м² (трехкомнатная квартира на 6 этаже 16-этажного дома, 2006 года постройки, инвентарный номер в ЕГРНИ 500/D-718822) |
| **Начальная цена** | 2 164 677 200 рублей |
| **Сумма задатка** | 216 000 000 рублей |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

*Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.* Для участия в аукционе по нескольким предметам торгов необходимо внести задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится **26 апреля 2016 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 11.04.2016 по 22.04.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 26 апреля 2016 года ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ КОНФИСКОВАННОГО ИМУЩЕСТВА

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение, продаваемого имущества)** | Земельный участок с кадастровым номером 623681704601000069, площадью 0,2059 га, расположенный по адресу: Минский район, Ждановичский с/с, д. Каменная горка и расположенное на нем незавершенное, незаконсервированное капитальное строение (назначение – жилой дом), состоящее из жилого дома площадью 148 м², цокольного этажа площадью 345 м² и пристройки площадью 121 м² |
| **Начальная цена** | 3 270 672 000 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 327 000 000 белорусских рублей |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.* Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится **26 апреля 2016 г. в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 11.04.2016 по 22.04.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36.**

# ОАО «Завод «Белпласт»

г. Минск, ул. Гусовского, 2. УНП 100008342

## Бухгалтерский баланс на 1 января 2016 г.

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2015 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | **190** | **50082** | **51811** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | **290** | **11400** | **9386** |
| **БАЛАНС** | **300** | **61482** | **61197** |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | **490** | **50536** | **54137** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **590** | **-** | **405** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **690** | **10946** | **6655** |
| **БАЛАНС** | **700** | **61482** | **61197** |

## Отчет о прибылях и убытках за январь–декабрь 2015 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2015 года | За январь–декабрь 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 21960 | 18283 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (18086) | (13673) |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | 3874 | 4610 |
| Управленческие расходы | 040 | (6234) | (4389) |
| Расходы на реализацию | 050 | (320) | (313) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | (2680) | (11) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | (3075) | (137) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130 ± 140) | 150 | (357) | 304 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 150) | 160 | (3432) | 167 |
| Налог на прибыль | 170 | - | (79) |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 160 | 153 | - |
| Чистая прибыль (убыток) (± 160 – 170 ± 180 ± 190 – 200) | 210 | (3290) | 9 |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | (3290) | 29534 |

**Руководитель** **В.Е.Финогенов**

**Главный бухгалтер** **Г.А. Капусто**

Количество акционеров на конец отчетного периода – 143, в том числе: юридических лиц – 4, физических лиц – 139.

Данные отчетности подтверждены аудиторской проверкой ООО «Трастаудит Плюс», зарегистрированной решением Мингорисполкома от 18.12.2013 г. №192181088. Бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Завод «Белпласт» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение на 31 декабря 2015 г., а также финансовые результаты деятельности за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: 29 марта 2016 г.

# Ликвидатор объявляет о продаже следующего имущества ДУП «ПМК-215» УП «Минскоблсельстрой» (УНП 690019233):

**Таблица №1**

| № п/п лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов (движимое имущество) | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|
| 1 | Кусторез Still | 722 880 |
| 2 | Сварочный аппарат НТС КАВИК | 274 320 |
| 3 | Полуприцеп КАЗ-9368 | 2 669 400 |
| 4 | Автомобиль ЗИЛ 130V1 | 4 179 000 |
| 5 | Копировальный аппарат IR1600 | 890 640 |
| 6 | Компьютер Филипс с МФУ MF4018 I-Sensys и пр. комплектующими, 2009 год | 245 280 |
| 7 | Компьютер ТАО с принтером Samsung ML-2010PR и пр. комплектующими, 2009 год | 235 320 |
| 8 | Компьютер Финист с комплектующими, 1998 год | 224 880 |
| 9 | Компьютер Финист комплектующими, 1998 год | 224 880 |
| 10 | Компьютер АСЕР с комплектующими, 2008 года | 224 880 |
| 11 | Компьютер с комплектующими, 1996 года | 224 880 |
| 12 | Форма для перемычек на 10 отделений (1,3х3 м) | 457 800 |
| 13 | Форма для перемычек на 10 отделений (1,3х3 м) | 457 800 |
| 14 | Форма для перемычек на 10 отделений (1,3х3 м) | 457 800 |
| 15 | Форма для перемычек на 5 отделений (0,8х3 м) | 619 440 |
| 16 | Форма для перемычек на 5 отделений (0,8х3 м) | 619 440 |
| 17 | Форма для перемычек на 5 отделений (0,8х3 м) | 619 440 |
| 18 | Форма для перемычек на 12 отделений (2х1,1м) | 549 360 |
| 19 | Емкость для хранения нефтепродуктов, 11 м³ | 2 657 400 |
| 20 | Емкость для хранения нефтепродуктов, 11 м³ | 2 657 400 |
| 21 | Емкость для хранения нефтепродуктов, 11 м³ | 2 657 400 |
| 22 | Емкость, объем 78 м³ | 4 782 720 |
| 23 | Емкость, объем 78 м³ | 4 782 720 |
| 24 | Станок для распиловки дерева | 3 307 560 |
| 25 | Заточный станок, инв. № 1048 | 412 080 |
| 26 | Плиты перекрытия 3,25х1,45 м | 61 500 |
| 27 | Фундаментная подушка 1,95х50 (кол-во: 13 шт.) | 585 000 |
| 28 | Нивелир НИ-3, произ. Украина (в комплекте треноги, линейка) | 192 000 |
| 29 | Бензопила | 154 810 |

Торги в отношении имущества, указанного в таблице №1, проводятся повторно шестой раз. Публикация об аукционе ранее публиковалось 15.03.2016 г. в газете «Звязда». Цена на предметы торгов движимого имущества в таблице №1 снижена на 90%, за исключением лотов №№3–4 таблицы №1 – цена снижена на 75%.

**Таблица №2**

| № п/п лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов (недвижимое имущество) | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. №663/С-10604, общая площадь, кв.м – 941,7, расположенное по адресу: город Мядель, ул. Интернациональная, 17 на земельном участке площадью 2,5099 га с кадастровым №624050100001001502 на праве постоянного пользования | 162 240 000 |

Торги в отношении недвижимого имущества, указанного в таблице №2, проводятся повторно четвертый раз. Публикация об аукционе ранее публиковалось 30.01.2016 г. в газете «Звязда». Цена на предметы торгов снижена на 60%.

**Таблица №3**

| № лота п/п | Наименование | Ед. изм. | Кол-во | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Кабель сварочный | пог.м | 24,00 | 50 280 |
| 2 | Провод ПВС 3,0х1,5 | м | 120,00 | 259 879 |
| 3 | Провод 2х6 б\у | м | 100,00 | 252 000 |
| 4 | Сетка плетен. зелёная | рул. | 2,00 | 869 400 |
| 5 | Удлинитель 10.9 | шт. | 1,00 | 54 565 |
| 6 | Арматура (в ассортименте) | кг | 970,92 | 2 648 418 |
| 7 | Блок балконный | м² | 20,83 | 1 104 320 |
| 8 | Блок дверной | м² | 10,00 | 492 790 |
| 9 | Блок оконный | м² | 26,92 | 2 608 593 |
| 10 | Блок оконный 4,5-6 | шт. | 6,00 | 198 363 |
| 11 | Ванна чугунная 170х70 | шт. | 1,00 | 948 312 |
| 12 | Вентблоки | шт. | 2,00 | 22 705 |
| 13 | Вентель | шт. | 30,00 | 106 875 |
| 14 | Воронка расширительная | шт. | 8,00 | 48 310 |
| 15 | Выключатель | шт. | 61,00 | 46 865 |
| 16 | Выключатель автоматический | шт. | 1,00 | 9 660 |
| 17 | Головка д. 50 | шт. | 11,00 | 98 960 |
| 18 | Дверь подвальная | шт. | 19,00 | 4 289 984 |
| 19 | Динрейка | шт. | 1,00 | 8 820 |
| 20 | Доска п/оконная | пог.м | 127,80 | 1 511 850 |
| 21 | Доска подоконная | м² | 3,33 | 85 625 |
| 22 | Доска подоконная окраш. | м² | 16,02 | 1 259 045 |
| 23 | Кабель 1х16 б/у | м | 34,00 | 117 167 |
| 24 | Колено 90/60 | шт. | 16,00 | 54 096 |
| 25 | Кольца резиновые САМ | шт. | 4,00 | 23 784 |
| 26 | Конек | шт. | 5,00 | 34 169 |
| 27 | Контрогайка | шт. | 357,00 | 120 155 |
| 28 | Кран шаровой | шт. | 29,00 | 299 220 |
| 29 | Крепление для кронштейна | шт. | 153,00 | 71 140 |
| 30 | Крестовина | шт. | 92,00 | 153 351 |
| 31 | Лючок 200х400 | шт. | 1,00 | 30 464 |
| 32 | Метчик М-20х2 | шт. | 1,00 | 14 549 |
| 33 | Нагреватель воздуха газ. | шт. | 1,00 | 550 364 |
| 34 | Нагреватель промышленный | шт. | 1,00 | 290 553 |
| 35 | Окно ОД 10.9.9 | шт. | 3,00 | 2 373 975 |
| 36 | Отвод | шт. | 1 007,00 | 811 009 |
| 37 | Планка | шт. | 15,00 | 117 413 |
| 38 | Планка торцовая | пог.м | 209,00 | 3 287 449 |
| 39 | Провод САПС б/у | м | 68,20 | 124 170 |
| 40 | Рама | шт. | 17,00 | 362 877 |
| 41 | Рейка 2 метра | шт. | 1,00 | 35 280 |
| 42 | Рейка контрольная | шт. | 2,00 | 86 833 |
| 43 | Рейка контрольная | шт. | 1,00 | 64 386 |
| 44 | Рулетка 10 метров | шт. | 1,00 | 22 479 |
| 45 | Смеситель | шт. | 4,00 | 93 534 |
| 46 | СПД 10-4-10-4-10-стеклопакеты | м² | 2,20 | 76 595 |
| 47 | Стекло оконное | м² | 10,37 | 63 188 |
| 48 | Стеклопакет двухкамерный | м² | 0,99 | 31 338 |
| 49 | Стеклоткань | м | 88,00 | 158 189 |
| 50 | Тройник | шт. | 67,00 | 291 913 |
| 51 | Тройник оцинков.ду-15 | шт. | 12,00 | 33 702 |
| 52 | Тройник соединительный | шт. | 6,00 | 57 018 |
| 53 | Труба металлопласт | пог.м | 9,00 | 26 273 |
| 54 | Труба ВГП д.25 | м | 5,00 | 48 123 |
| 55 | Труба ВГП ду40 ст. | кг | 34,00 | 97 104 |
| 56 | Труба Д-150-ЧВ | шт. | 2,00 | 167 545 |
| 57 | Труба ПНД 160х1,5 м | шт. | 3,00 | 83 916 |
| 58 | Труба ПНД 160х4 м | шт. | 4,00 | 298 368 |
| 59 | Удлинитель д. 10 м | шт. | 1,00 | 19 450 |
| 60 | Удлинитель д.15 м | шт. | 2,00 | 58 351 |
| 61 | Хомут 90 | шт. | 65,00 | 99 634 |
| 62 | Цветочница | шт. | 3,00 | 604 800 |
| 63 | Чаша | шт. | 2,00 | 111 048 |
| 64 | Черепица | шт. | 222,00 | 27 330 |
| 65 | Черепица вентиляционная | шт. | 37,00 | 179 083 |
| 66 | Черепица пазовая | шт. | 132,00 | 110 607 |
| 67 | Черепица половинчатая | шт. | 120,00 | 222 768 |
| 68 | Черепица проходная | шт. | 10,00 | 46 284 |
| 69 | Черепица снегозадерживающая | шт. | 62,00 | 274 722 |
| 70 | Черепица фронтонная левая | шт. | 8,00 | 20 150 |
| 71 | Шайба | кг | 31,50 | 92 426 |
| 72 | Швеллер | кг | 157,60 | 377 758 |
| 73 | Щиты подмостей | м² | 4,91 | 26 368 |
| 74 | Осушитель воздуха б/у | шт. | 1 | 472 500 |

Торги в отношении имущества, указанного в таблице №3, проводятся повторно четвертый раз. Публикация об аукционе ранее публиковалось 15.03.2016 г. в газете «Звязда». Цена на предметы торгов снижена на 65%.

**Таблица №4**

| № лота п/п | Наименование | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|
| 1 | Емкость на колесах объем 2 м.куб. (инв. №72) | 1 707 000 |
| 2 | Емкость на колесах объем 3 м.куб. (инв. №71) | 2 405 400 |
| 3 | Сверлильный аппарат (инв. №399) | 1 939 800 |

Торги в отношении имущества, указанного в таблице №4, проводятся повторно второй раз. Публикация об аукционе ранее публиковалось 15.03.2016 г. в газете «Звязда». Цена на предметы торгов снижена на 50%.

**Таблица №5**

| № лота п/п | Наименование | Ед. изм. | Кол-во | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Аппарат телефонный | шт. | 2,000 | 162 000 |
| 2 | Балка настила | шт. | 24,000 | 956 889 |
| 3 | Бачок оцинкованный | шт. | 24,000 | 45 215 |
| 4 | Блоки г/с б/у обрезки. бой | м³ | 23,970 | 5 377 079 |
| 5 | Блоки газо-силикатные б/у | м³ | 0,140 | 11 756 |
| 6 | Ванна б/у | шт. | 1,000 | 326 283 |
| 7 | Вентрешетки | шт. | 67,000 | 1 600 953 |
| 8 | Вибратор | шт. | 2,000 | 1 386 336 |
| 9 | Вибратор б/у | шт. | 5,000 | 3 088 344 |
| 10 | Гвоздодер | шт. | 1,000 | 29 790 |
| 11 | Гибкий вал | шт. | 2,000 | 406 510 |
| 12 | Гибкий вал б/у | шт. | 1,000 | 244 710 |
| 13 | Гигрометр ВИТ-1 | шт. | 1,000 | 14 186 |
| 14 | Горизонталь | шт. | 20,000 | 278 837 |
| 15 | Дрель аккумуляторная | шт. | 1,000 | 434 655 |
| 16 | Заготовка из листа | шт. | 11,000 | 87 674 |
| 17 | Заготовка из трубы | шт. | 2,000 | 30 566 |
| 18 | Заготовка оцинков. | кг | 256,200 | 32 496 |
| 19 | Задвижка б/у | шт. | 2,000 | 84 254 |
| 20 | Задвижка накладная | шт. | 25,000 | 19 105 |
| 21 | Заземляющий элемент | шт. | 1,000 | 14 159 |
| 22 | Закладные детали | шт. | 3,000 | 54 027 |
| 23 | Заклепочник | шт. | 1,000 | 87 432 |
| 24 | Закрепа | шт. | 620,000 | 40 720 |
| 25 | Защёлка ЗЩ | шт. | 10,000 | 123 969 |
| 26 | Звонок электрический | шт. | 1,000 | 24 688 |
| 27 | Змейка | шт. | 1,000 | 16 146 |
| 28 | Знаки дорожные | шт. | 17,000 | 710 209 |
| 29 | Калькулятор | шт. | 4,000 | 184 745 |
| 30 | Калькулятор нераб. | шт. | 5,000 | 64 825 |
| 31 | Калькулятор-1 | шт. | 3,000 | 285 211 |
| 32 | Каска строительная | шт. | 5,000 | 90 514 |
| 33 | Кельма для г/силикатных блоков | шт. | 2,000 | 235 485 |
| 34 | Кельма кам. 200 мм | шт. | 1,000 | 14 069 |
| 35 | Кельма трапецевидная | шт. | 2,000 | 29 255 |
| 36 | Колонны | м³ | 3,020 | 25 433 |
| 37 | Корпус решетки ливнестока | шт. | 1,000 | 38 892 |
| 38 | Краги | шт. | 6,000 | 50 777 |
| 39 | Кронштейн для умывальника | шт. | 8,000 | 47 796 |
| 40 | Крючок для вязки арматуры | шт. | 1,000 | 378 000 |
| 41 | Кусачики боковые | шт. | 1,000 | 23 906 |
| 42 | Лом | шт. | 2,000 | 37 632 |
| 43 | Лопата | шт. | 6,000 | 57 482 |
| 44 | Лопата для очистки снега | шт. | 1,000 | 30 218 |
| 45 | Лотки ж/б | м³ | 3,470 | 133 094 |
| 46 | Миксер малярный | шт. | 1,000 | 31 949 |
| 47 | Молоток Сат. | шт. | 1,000 | 123 606 |
| 48 | Молоток слесарный | шт. | 4,000 | 50 758 |
| 49 | Набор инструментов | шт. | 1,000 | 145 509 |
| 50 | Набор отвёрток | шт. | 1,000 | 24 062 |
| 51 | Набор щупов | шт. | 2,000 | 37 800 |
| 52 | Наволочка 70х70 | шт. | 25,000 | 407 160 |
| 53 | Напильник | шт. | 2,000 | 36 298 |
| 54 | Одеяло п/шерстяное | шт. | 3,000 | 244 617 |
| 55 | Одеяло п/шерстяное 09с-3 | шт. | 1,000 | 59 859 |
| 56 | Опорная пята | шт. | 10,000 | 49 496 |
| 57 | Отбойный молоток | шт. | 1,000 | 387 153 |
| 58 | Отвертка | шт. | 7,000 | 59 928 |
| 59 | Отвес строительный | шт. | 8,000 | 120 658 |
| 60 | Поддоны деревян. | шт. | 2,000 | 173 681 |
| 61 | Патрон б/у | шт. | 5,000 | 31 308 |
| 62 | Перемычки г/силикатные | м³ | 0,069 | 144 481 |
| 63 | Перемычки ж/б | м³ | 0,672 | 1 908 986 |
| 64 | Переноска | шт. | 2,000 | 94 077 |
| 65 | Переноска А | шт. | 2,000 | 73 356 |
| 66 | Переноска д. 10 | шт. | 2,000 | 128 202 |
| 67 | Перчатки диэлектрические | пар | 2,000 | 25 115 |
| 68 | Перчатки резиновые | пар | 3,000 | 22 680 |
| 69 | Петля накладная ПН1-110 | шт. | 4,000 | 44 998 |
| 70 | Петля оконная | шт. | 26,000 | 22 764 |
| 71 | Петля ПН-130 | шт. | 63,000 | 270 728 |
| 72 | Пила лобзиковая электрическая | шт. | 1,000 | 507 600 |
| 73 | Пила ручная электрич. | шт. | 1,000 | 696 600 |
| 74 | Пистолет д/герметиков | шт. | 1,000 | 25 649 |
| 75 | Плотнометр | шт. | 1,000 | 253 800 |
| 76 | Плита ж/б б/у | м³ | 5,130 | 2 462 398 |
| 77 | Плитка бетонная тротуарная | м² | 6,660 | 296 096 |
| 78 | Плоскогубцы | шт. | 5,000 | 133 432 |
| 79 | Поддоны Радош. | шт. | 51,000 | 3 304 800 |
| 80 | Поддоны 1030х1030 | шт. | 28,000 | 2 314 008 |
| 81 | Поддоны ЗСМ | шт. | 1,000 | 102 454 |
| 82 | Поддоны ДОЗ | шт. | 2,000 | 206 885 |
| 83 | Поддоны П2-2,4 930х1230 | шт. | 5,000 | 425 394 |
| 84 | Подушка 58,х58 | шт. | 4,000 | 90 577 |
| 85 | Подушка ж/б | м³ | 3,496 | 1 351 595 |
| 86 | Подушка пост. | шт. | 3,000 | 62 240 |
| 87 | Подушки 68х68 | шт. | 3,000 | 102 144 |
| 88 | Подшлемник | шт. | 15,000 | 134 501 |
| 89 | Покрывало | шт. | 2,000 | 57 862 |
| 90 | Полоса | кг | 175,820 | 1 449 264 |
| 91 | Полотнище с рукавицами | шт. | 2,000 | 114 048 |
| 92 | Простынь 1,5 м | шт. | 40,000 | 939 600 |
| 93 | Профиль потолочный ПЛ 60-27 | пог.м | 162,000 | 965 779 |
| 94 | Пылесос | шт. | 1,000 | 158 985 |
| 95 | Радиаторы 2К60П | шт. | 14,000 | 1 298 324 |
| 96 | Релле | шт. | 1,000 | 12 693 |
| 97 | Ремень стяжной | шт. | 1,000 | 96 995 |
| 98 | Решетка ливнестока | шт. | 1,000 | 33 954 |
| 99 | Ригель дверной | шт. | 2,000 | 14 400 |
| 100 | Розетка потолочная | шт. | 8,000 | 12 152 |
| 101 | Розетка РА 10-214 б/у | шт. | 6,000 | 86 397 |
| 102 | Розетка РА 16-263 б/у | шт. | 2,000 | 61 920 |
| 103 | Розетка РА16-255 б/у | шт. | 7,000 | 66 150 |
| 104 | Розетка РС16 б/у | шт. | 2,000 | 28 260 |
| 105 | Рулетка 7,5 м | шт. | 1,000 | 52 197 |
| 106 | Связь диагональная | шт. | 6,000 | 158 285 |
| 107 | Сетка-рабица б/у | м² | 18,000 | 264 956 |
| 108 | Стулья | шт. | 17,000 | 1 669 621 |
| 109 | Тачка | шт. | 2,000 | 941 363 |
| 110 | Телефонный аппарат | шт. | 3,000 | 129 234 |
| 111 | Тёрка пенопласт | шт. | 11,000 | 203 562 |
| 112 | Тёрка пенопласт | шт. | 6,000 | 188 815 |
| 113 | Термометр ПТП | шт. | 1,000 | 20 249 |
| 114 | Термометр ТБП | шт. | 1,000 | 38 880 |
| 115 | Удлинитель 10.9 | шт. | 2,000 | 280 620 |
| 116 | Форма для плитки, 50*50 | шт. | 2,000 | 321 840 |
| 117 | Форма забора | шт. | 4,000 | 2 220 620 |
| 118 | Форма куба | шт. | 2,000 | 313 200 |
| 119 | Эл. плита 3-комф. | шт. | 1,000 | 1 040 082 |
| 120 | Эл. рубанок | шт. | 1,000 | 477 360 |
| 121 | Эл. рубанок | шт. | 1,000 | 661 500 |
| 122 | Ящик для инструмента | шт. | 1,000 | 63 897 |
| 123 | Ящик для инструмента б/у | шт. | 1,000 | 73 440 |
| 124 | Трансформатор сварочный | шт. | 1,000 | 4 212 000 |
| 125 | Трансформатор | шт. | 1,000 | 758 592 |
| 126 | Трансформатор | шт. | 1,000 | 1 088 003 |
| 127 | Трансформатор б/у | шт. | 2,000 | 193 648 |

Торги в отношении имущества, указанного в таблице №5, проводятся повторно первый раз. Публикация об аукционе ранее публиковалось 01.03.2016 г. в газете «Звязда». Цена на предметы торгов снижена на 10%.

Торги в виде аукциона состоятся **20 апреля 2016 года в 12.00** по адресу: **г. Мядель, ул. Интернациональная, д. 4** (по месту нахождения имущества). Ознакомиться с предметом торгов можно по месту его нахождения предварительно согласовав дату и время с организатором торгов. **Шаг аукциона – 5 процентов.**

**ПРОДАВЕЦ – ДУП «ПМК-215» УП «Минскоблсельстрой» (тел.: (017) 268-54-52).**

**ОРГАНИЗАТОР ТОРГОВ – ООО «Партнёр-Консультант» (220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-10, тел.: (017) 268-54-52 (Анастасия).**

Прием заявок начинается с момента выхода объявления, осуществляется по месту нахождения организатора торгов, и прекращается за три дня до начала торгов. Задаток вносится до подачи заявления на участие в торгах в размере 10 процентов от начальной цены предмета торгов (с НДС) на р/с 3012452420020 в Филиале ОАО «Белагропромбанк» Минское областное управление, код 942, УНП 690019233, получатель – ДУП «ПМК-215» УП «Минскоблсельстрой», назначение платежа: задаток за предмет торгов.

При признании торгов несостоявшимися в связи с наличием заявления на участие в них только от одного участника, возможна продажа предмета торгов этому участнику по цене, увеличенной на 5 процентов.

К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме с учетом НДС 20% не позднее 5 рабочих дней (30 рабочих дней для недвижимого имущества) с даты подписания договора купли-продажи.

■ Нарасхват

# НАСТАЎНІК — ВЕЛЬМІ ЗАПАТРАБАВАНАЯ ПРАФЕСІЯ,

## або Ці можна на размеркаванні пачуць кожнага выпускніка?

**У той час, як студэнты выпускных курсаў многіх беларускіх ВНУ працягваюць ліхаманкава шукаць арганізацыю, якая пагадзілася б узяць да сябе на працу маладога спецыяліста (а сёлета гэтая задача ўскладнілася), выпускнікоў педагагічных спецыяльнасцяў разбіраюць на рынку працы, як гарачыя піражкі ў базарны дзень. Больш за тое, за імі нават выстройваюцца ў чэргі працадаўцы... Журналіст «Звязды» наведаў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, каб пераканацца ў гэтым на ўласныя вочы.**

### ВАШ ТАВАР — НАШ КУПЕЦ

На парадку дня — размеркаванне выпускнікоў двух факультэтаў: прыродазнаўства і філалагічнага. У папярэднія гады гуманітарыям, якія жадалі застацца працаваць у Мінску, але вакантнага месца па атрыманай спецыяльнасці не было, прапаноўвалі працу на іншых педагагічных пасадах. Чакаем паўтарэння гэтага сцэнарыя, тым больш што у горадзе кадравая праблема ў дашкольных установах зусім не страціла сваёй актуальнасці. Але ўжо ў першыя хвіліны даводзіцца пераканацца, што... памыляемся. Сярод «купцоў», якія присутнічаюць на размеркаванні, два дырэктары школ. Прычым абодва прыйшлі сюды з надзеяй атрымаць у сваю навучальную ўстанову менавіта філолага.

**Ёсць шмат папулярных у моладзі спецыяльнасцяў, на якія мода прыходзіць і сыходзіць, а прафесія педагога заўсёды будзе запатрабаваная грамадствам.**

— Я ведаю, што да красавіка звычайна ўжо на ўсіх выпускнікоў ёсць заяўкі, але раптам мне пашанцуе, — усміхаецца дырэктар Зеленаборскага вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячы сад — сярэдняя школа, што ў Смалявіцкім раёне, Таіса Анатолеўна Калбасенка, — тым больш што і я не з пустымі рукамі. Магу забяспечыць маладога спецыяліста жыллём. У нас для настаўнікаў ёсць свабодная двухпакаёвая арэндная кватэра за сімвалічную плату. Можна ўзяць адразу двух педагогаў, і ў кожнага з іх будзе свой асобны пакой. У Зеленаборскай школе працуе шмат былых вучняў. І я — выпускніца школы, якую цяпер узначальваю, і мой наместнік... У нас цудоўны калектыў.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Віктар Францішкавіч Савіцкі, дырэктар Азярцоўскай сярэдняй школы з Мінскага раёна, таксама спадзяецца знайсці для сваёй навучальнай установы настаўніка рускай мовы і літаратуры. Да Мінска — рукой падаць. А жыллёвыя праблемы педагогаў абяцаюць вырашыць...

### БЕЗ СЮРПРЫЗАЎ

Але першымі размяркоўваюцца будучыя настаўнікі хіміі, біялогіі і геаграфіі... Праўда, большасць з іх ужо мае педагагічны досвед і яшчэ падчас вучобы сталі ў школе выкладаць. Таму многія прынеслі персанальныя заяўкі са сталічных школ, дзе іх ужо цудоўна ведаюць.

— Надзея Кашуба працуе ў 212-й сталічнай школе, адтуль ёсць запыт. Прапануем размеркаваць яе па месцы працы, — просіць дэкан факультэта.

— Гэта прэтэндэнт на першую катэгорыю, наша «зорачка», — канстатуе прадстаўнік сталічнага Камітэта па адукацыі.

Высвятляецца, што дзяўчына зусім нядаўна выступала ў фінале гарадскога конкурсу прафесійнага майстэрства «Сталічны настаўнік — сталічнай адукацыі 2016» у намінацыі «Педагагічны дэбют», дзе стала ўладальніцай дыплома першай ступені. Канешне, заяўку школы задавальняюць...

Камісія зачытвае прозвішчы выпускнікоў і месцы, што прапануюцца для працаўладкавання. Адразу становіцца зразумелым, што для маладых людзей размеркаванне не з'яўляецца непрыемным сюрпрызам. Мінчане застаюцца ў Мінску — для ўсіх у сталічных школах знаходзяцца месцы. Студэнтка платнай формы навучання (мінчанка) таксама пажадала размеркавацца і атрымаць статус маладога спецыяліста. Ёй прапанавалі планавае месца ў Партызанскім раёне сталіцы.

А вось іншагароднія выпускнікі, як правіла, вяртаюцца на радзіму, бліжэй да бацькоўскага дому. За Мінск ніхто не трымаецца... Выпускніца з Брагінскага раёна едзе дамоў.

— Там настаўнікі вельмі патрэбныя! — падтрымліваюць усе яе выбар.

Яшчэ адна цікавая тэндэнцыя — многія студэнты свядома змяняюць свой рэгіён пражывання на іншы.

Так, выпускніца родам са Шчучына выбрала Валожынскі раён.

— Правільна, пакуль маладая, трэба вывучаць геаграфію краіны, — падбадзёрвае **першы прарэктар БДПУ Святлана КОПЦЕВА.**

Дзяўчына з Докшыц пажадала працаваць у Вілейскім раёне, выпускніца з Баранавічаў едзе працаваць у Дзяржынскі раён, а хлопец з Оршы — у Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня».

Гамяльчанка выбірае Мінскі раён.

— Вы ведаеце, што жыллё давядзецца самастойна арандаваць? — цікавяцца ў яе члены камісіі па размеркаванні.

— Так!

— Калі вас усё задавальняе, то і мы не супраць.

### БУДУЧЫ МУЖ — ЯШЧЭ НЕ АРГУМЕНТ

А вось жаданне яшчэ адной выпускніцы быць размеркаванай у Ліду не выклікае аптымізму ў прадстаўнікоў сістэмы адукацыі Мінскай вобласці, якія присутнічаюць на размеркаванні.

— А чаму менавіта ў Ліду?

— Будучы муж адтуль.

— Такога паняцця, як «будучы муж», Палажэнне аб размеркаванні не ўтрымлівае...

— У дзяўчыны вельмі высокі сярэдні бал 8,79. І навукай яна займалася, у навуковых канферэнцыях удзельнічала. У яе права выбару. Кіраўнік дзяржавы — таксама за сям'ю. Дык не будзем ствараць для яе перашкоды, — заступаюцца за сваю студэнтку прадстаўнікі факультэта.

— Мінскай вобласці такія выпускнікі таксама патрабуюцца, — з жалем канстатуюць заказчыкі са сталічнага рэгіёна, разумеючы, што ўсё ж такі давядзецца саступіць...

А вось іншай студэнтцы з Мінскай вобласці, якая прывезла запыт на сябе з Лідскага раёна, пашанцавала менш.

— У нас ёсць для вас планавае месца ў Любанскім раёне.

— Але мы з сям'ёй пераязджаем у Ліду, да таго ж там мяне чакае малады чалавек.

— Гэта ўсё толькі эмоцыі. Мы лічым, што трэба размяркоўвацца ў Любань. Іншая справа, калі б вы ехалі да мужа. Калі ўступіце ў шлюб, у вас з'явіцца падставы для пераразмеркавання, а запыты з іншых абласцей мы задавальняем, толькі калі запоўнены ўсе планаваныя месцы ў Мінскай вобласці — нашага галоўнага заказчыка.

Дзяўчына відавочна засмучана, бо яна свядома адмовілася ад месца ў Мінску, дзе зараз працуе настаўнікам хіміі, і аддала вакансію аднакурсніку. Прыняцце рашэння адкладваюць да 26 красавіка...

Апошнім размяркоўваецца студэнт-завочнік спецыяльнасці «Геаграфія. Ахова прыроды». Малады чалавек падлягае абавязковаму размеркаванню з той прычыны, што большасць часу навучаўся на дзённай бюджэтнай форме, а потым перавёўся на завочную. Зараз ён індывідуальны прадпрымальнік, аднак прыняў рашэнне працаваць у школе. У тых жа, хто не хоча працаваць па атрыманай спецыяльнасці, ёсць выйсце — кампенсаваць выдаткі за час свайго навучання на бюджэтным месцы...

### НЕ З ПУСТЫМІ РУКАМІ

...Шэрагі выпускнікоў, якія чакаюць сваёй чаргі, паступова радзеюць, але дырэктары школ, што асабіста прыехалі па кадры, усё ж не застаюцца з пустымі рукамі. Камісія па размеркаванні дапамагае ім знайсці аргументы, каб зацікавіць выпускнікоў....

— Вам, маладому спецыялісту, ужо і кватэру прапануюць. Калі першы раз заплаціце за жыллё, адчуеце розніцу.

— Ад школы да Жодзіна — усяго 20 хвілін. А там дарога адкрыта хоць да Масквы, хоць да Мінска... Яшчэ прыедзеце і скажаце «дзякуй», што ўгаварылі...

— Мне з самай раніцы не шанцавала, але справы ўжо наладжваюцца, — з задавальненнем канстатуе, уводзячы за сабой студэнтку, дырэктар Азярцоўскай сярэдняй школы Віктар Францішкавіч Савіцкі.

— Дык вы раней прыязджайце і нагледжвайце для сябе маладых спецыялістаў.

— Ужо ўсіх нагледзелі. Кожны год бяром ад вас на працу 6—8 чалавек. Але тут проста ўзніклі непрадбачаныя абставіны...

### ПОПЫТ І ПРАПАНОВА

— Адзін з прынцыпаў работы камісіі па размеркаванні — зрабіць усё для таго, каб працоўная дзейнасць выпускнікоў пачыналася ў максімальна камфортных для іх умовах. Натуральна, не парушаючы пры гэтым заканадаўства, — запэўнівае **начальнік аддзела кадраў БДПУ Валерый АЛАВЯННІКАЎ.** — Проста выдатна, калі выпускнік размяркоўваецца ў школу, дзе ён праходзіў педагагічную практыку або ўжо працаваў там настаўнікам, у камфортную псіхалагічную атмасферу. Прашу заўважыць, што цяпер магчымасць працаўладкавання ў Мінску і абласных цэнтрах не залежыць ад наяўнасці рэгістрацыі ў гэтых населеных пунктах, а вызначаецца толькі самім наймальнікам.

**Сярод «купцоў», якія присутнічаюць на размеркаванні, два дырэктары школ. Прычым абодва прыйшлі сюды з надзеяй атрымаць у сваю навучальную ўстанову менавіта філолага.**

Сёння ў сталіцы найбольш запатрабаваныя настаўнікі пачатковай школы і выхавальнікі дашкольных устаноў. У нас ужо прайшло размеркаванне выпускнікоў факультэта пачатковай адукацыі. Патрэба мінскіх школ у настаўніках пачатковых класаў — 153 чалавекі, а мы размеркавалі ў сталіцу 31 выпускніка. Гэта, між іншым, 38% ад агульнай іх колькасці — зусім нямала. Асноўныя нашы заказчыкі — установы адукацыі Мінска і Мінскай вобласці, куды мы размяркоўваем да 80% нашых выпускнікоў. Але ўсе роўна задаволіць усе заяўкі Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама па пачатковай школе не можам. На многіх спецыяльнасцях у нашых выпускнікоў — вялікі выбар. Можна ўсё абдумаць і, з улікам сваіх сямейных абставін, прыняць найбольш узважанае рашэнне.

Увогуле, ёсць шмат папулярных у моладзі спецыяльнасцяў, на якія мода прыходзіць і сыходзіць, а прафесія педагога заўсёды будзе запатрабаваная грамадствам.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# ВЫКЛАДАННЕ ДЛЯ «ПАКАЛЕННЯ ВЯЛІКАГА ПАЛЬЦА»

**Замежныя эксперты ў галіне тэхналогій і адукацыі называюць сучасную моладзь «пакаленнем вялікага пальца» — з той прычыны, што хлопцы і дзяўчаты «працуюць» гэтым пальцам на мабільных прыладах. Дзятва таксама «павар'яцела» на гаджэтах. На гэтым фоне ў Беларусі ўсё актыўней укараняюцца новыя адукацыйныя тэхналогіі, якія, у прыватнасці, дазваляюць дома праслухаць і праглядзець лекцыі. Нядаўна ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце абмеркавалі новыя тэхналогіі ў адукацыі.**

— Выкладчыкі і студэнты бізнес-школ выкарыстоўваюць сучасныя гаджэты. Навучанне можа адбывацца ў любы час і ў любым месцы. Цяпер праблема не ў тым, якім чынам весці навучанне, а ў тым, як «усталяваць» мабільныя прылады і гаджэты на адзіную адукацыйную платформу, — расказвае **Алена ЛУЧАНКОВА, загадчыца кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта.**

Яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму ў ЗША ўпершыню быў ужыты тэрмін «перавернуты клас». Гэта адна з формаў змешанага навучання, сутнасць якога ў самастойным пошуку інфармацыі. Усё больш відомых маркетолагаў, эканамістаў, эколагаў і іншых «вузкіх» спецыялістаў у рэжыме «анлайн» адказваюць на пытанні. З пункту гледжання псіхалагічнай магчымасці, кожны успрымлівае інфармацыю ў тым выглядзе і аб'ёме, у якіх можа засвоіць.

— За гэтым метадам будучыня, і ён нам таксама падыходзіць, — упэўнена Алена Лучанкова. — Мы можам пайсці насустрач тым, хто хоча вучыцца не толькі ў аўдыторыі, але і самастойна.

У рамках рэспубліканскага фестывалю маладзёжнай навукі ВНУ Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт прэзентаваў праект «Новыя тэхналогіі і інструменты навучання бізнес-адміністраванню суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу Віцебскага рэгіёна». Ён быў рэалізаваны дзякуючы падтрымцы Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці ў Рэспубліцы Беларусь і фонду «Новая Еўразія». Кіруе праектам Галіна Яшава, прафесар, доктар эканамічных навук, загадчыца кафедры «Эканамічная тэорыя і маркетынг».

Калі коратка, праект уяўляе сабой запісаныя для праслухоўвання і прагляду лекцыі.

Прадстаўнікі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Брэсцкага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта (БДТУ), Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі таксама падзяліліся вопытам. Дыстанцыйнае навучанне, даводзілі яны, дазваляе эканоміць. У прыватнасці, на дарозе. Выкладчык БДТУ з Горак Магілёўскай вобласці можа цяпер не ехаць да студэнтаў у Пінскі філіял, а выкласці лекцыі на сайце.

